Адрас рэдакцыі і канторы: г. Віцебск, плац Волі, Палац працы, 3-ці паверх
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА 2 р. у мес.
Цана асобн. нумару 8 кап.

Тэлефоны рэдакцыі: Сакратарыят—1-73; нам рэдактара, партыйны і масавы сектары 4-76; сектары прамысловы, сельска гаспадарчы—72; рабоч. снабжэння і кааперацыі, сав. будаўніцтва пад. культурнага будаўніцтва 6-15, лістоў рабочых і калгаснікаў, бюро расследвання — 2-00 кантора—55; начальн рэдакцыі—4-56.

ВІЦЕБСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б, ГАРСОВЕТА І ГАРПРАФСОВЕТА.

СЕННЯ У НУМАРЫ

Аб фактах, прыведзеных у ЦО «Правда» ад 9-Х пад загалоўкам «Политическая слепота». Пастанова ЦК КП(б)Б.

СЁННЯ ДЗЕНЬ УРАДЖАЯ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. Вышэй сцяг барацьбы за большэвіцкія калгасы, за заможнае жыццё.

АДЗНАЧЫМ ДЗЕНЬ УРАДЖАЯ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ЎДАРНЫМ ЗАВЯРШЭННЕМ ЗБОЖЖАПАСТАВАК І АСЕННІХ С.-Г. РАБОТ, НОВЫМІ ПЕРАМОГАМІ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА БОЛЬШЭВІЦКІЯ КАЛГАСЫ, ЗА ЗАМОЖНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ КАЛГАСНАЕ ЖЫЦЦЁ.

Заваюем пяршынства ў соцыялістычным спаборніцтве з Гомельшчынай і Ярцаўскім раёнам Зах. вобласці.

АБ ФАКТАХ ПРЫВЕДЗЕНЫХ У АРТЫКУЛЕ У ЦО „ПРАВДА" АД 9 КАСТРЫЧНІКА 1933 г. ПАД ЗАГАЛОЎКАМ „ПОЛИТИЧЕСКАЯ СЛЕПОТА".

Пастанова ЦК КП(б)Б.

9 кастрычніка 1933 года ў „Праўдзе" змешчан артыкул „Политическая слепота", у якім зусім правільна адзначана абсалютна недапушчальнае адставанне Беларусі па азімай сяўбе ў радзе раёнаў і намеціўшаяся пагроза зрыва плана азімай сяўбы (на 5 кастрычніка Чырвонапольскі—56,4 проц., Сіроцінскі—73,0, Чашніцкі — 79,9 проц., Заслаўскі—71,5 проц., Тураўскі 79,2).

„Правда" таксама зусім правільна ўказвае на палітычную слепату партыйных арганізацый Беларусі ў пытанні аб прысядзібных участках зямлі. Сакратарыят ЦК асабліва падкрэслівае, што факты незаконных прырэзак прысядзібных участкаў за кошт агульнакалгаснага фонда, якія вядуць да ператварэння прысядзібнай гаспадаркі з дапаможнай у фактычна галоўную, з'яўляюцца вынікам невыстарчальнай рэвалюцыйнай пільнасці з боку раду партыйных арганізацый і няздольнасці іх выкрыць кулацкія манеўры, накіраваныя супроць калгаснага будаўніцтва.

Не гледзячы на прамыя пастановы ЦК УсеКП(б), на рад указанняў і практычных пастаноў ЦК КП(б)Б па гэтым пытанні (пастанова аб Б.-Кашалёўскім, Камарынскім раёнах і інш.)—падобнага роду факты (артыкул у „Правде") працягвае мець месца.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б. пастанаўляе:

1. Прапанаваць Дзяржынскаму і Камарынскаму РК КП(б)Б неадкладна разглядзець факты, паведамленыя ў артыкуле „Правды", прыняўшы меры да найстражэйшага пакарання вінаватых у кулацкім захваце зямель і аб прынятых мерах паведаміць ЦК.

2. Даручыць Наркамзему тав. Бенеку не пазней 10 кастрычніка ўвечары выслаць у гэтыя раёны правераных работнікаў Наркамзема для расследвання на месцы фактаў, звязаных з павялічэннем прысядзібных зямель калгаснікаў. Рэзультаты праверкі заслухаць на Сакратарыяце ЦК.

3. Сакратарыят ЦК асабліва адзначае, што факты, апублікаваныя ў „Правде", сведчаць таксама аб тым, што Дзяржынскі і Камарынскі РК КП(б)Б не мабілізавалі партыйную арганізацыю на барацьбу з кулацкімі манеўрамі, маючымі мэтай падрыў калгаснага лада, у рэзультаце чаго ў радах гэтых партыйных арганізацый у наяўнасці страта класавай пільнасці.

Сакратарыят ЦК абвяшчае вымову бюро РК Дзяржынскага і Камарынскага раёнаў і папярэджвае іх, што за дапушчэнне ў далейшым падобнага роду фактаў як бюро РК у цэлым, так і сакратары РК у асаблівасці будуць прыцягнуты да найстражэйшай партыйнай адказнасці.

4. Сакратарыят ЦК лічыць, што наяўнасць падобнага роду кулацкіх спроб зруйнаваць калгасную гаспадарку абходным шляхам, не заўважаных радам партыйных арганізацый, сведчыць аб тым, што партыйныя арганізацыі ў Беларусі яшчэ зусім невыстарчальна мабілізаваліся на барацьбу супроць антыкалгасных кулацкіх вылазак, накіраваных супроць калгаснага будаўніцтва, а таксама далёка не забяспечваюць канкрэтнага аператыўнага кіраўніцтва калгасамі, саўгасамі, і такімі баявымі ўчасткамі работы на сяле і калгаснага будаўніцтва, як: севазварот, ход і якасць азімай сяўбы, размеркаванне даходаў, работа калгасных брыгад і г. д.

5. Сакратарыят ЦК прапануе ўсім РК КП(б)Б праверыць наяўнасць падобнага роду скажэнняў калгаснага будаўніцтва ў сваіх раёнах з прыняццем усіх мер да неадкладнага выпраўлення дапушчаных памылак і скажэнняў і прыцягненнем вінаватых да адказнасці, тэрмінова паведамляючы ЦК аб кожным падобным выпадку.

6. Прапанаваць усім РК КП(б)Б, у адпаведнасці з пастановай ЦК УсеКП(б) ад 27 сакавіка 1933 г. аб празмерным росце прысядзібных участкаў, апублікаванай у „Правде":

а) праверыць выкананне прамога ўказання ЦК УсеКП(б) аб забароне нарэзкі зямель з калгасных, зямельных фондаў для прысядзібнага землякарыстання без дазвола вышэйшых партыйных і савецкіх органаў;

б) у выпадку незаконнай раздачы калгасных зямель прыняць меры да іх зварота ў агульнакалгасны фонд, прыцягваючы дапусціўшых такія скажэнні да найстражэйшай судовай адказнасці, як за парушэнне закона аб калгасным землякарыстанні.

7. Даручыць членам бюро ЦК, якія знаходзяцца ў раёнах, прасачыць за правядзеннем гэтай пастановы, прыцягваючы на месцы да суровай адказнасці вінаватых у патуранні кулацкім спробам сарваць калгаснае будаўніцтва.

ХОД СОЦСПАБОРНІЦТВА.

(Па даных на 10 кастрычніка).

	Віцебшчына.	Гомельшчына.
Збожжапастаўкі	62,3 проц.	78,27 проц.
Збожжаздача саўгасамі і калгасамі	70,9 „	66,51 „
Натураплата МТС	45,87 „	50,22 „
Зварот насенпазыкі	19,43 „	35 „
Разам	59,64 „	61,01 „
Выкапана бульбы	64 „	77 „
Бульбапастаўкі	49,5 „	20,88 „
Адгруж. Ленінграду	111,2 „	103 „
Сяўба азімых	101,8 „	91 „

Ход збожжапаставак па калгасна-сялянскім сектары на 13 кастрычніка.

(У тонах).

План	Паступіла	Проц. вык.	Прырост за 11 і 12 кастрычн.
2262,02	1674,4	74	224,4

ВЫКАНАЛІ ПЛАН ПАСТАВАК ЗБОЖЖА І БУЛЬБЫ.

Адзін з буйнейшых калгасаў, Сялюцкага сельсовета, калгас імя Калініна, 12 кастрычніка выканаў гадавы план збожжа—бульбапаставак. Калгас таксама разлічыўся па натураплаце з МТС

Калгас імя Калініна выканаў свае абавязкі па фінансавых плацяжах і здачы малака дзяржаве.

Зараз усе сілы пераключаюцца на завяршэнне ўборкі гародніны і адгрузкі яе Ленінграду, завяршэнне зяблівага ворыва, засыпку насенных фондаў для вясны будучага года і размеркавання прыбыткаў.

Старшыня калгаса Разумоўскі.

* *
*

Калгас імя Будзённага, Сялюцкага сельсовета, (старшыня Сандлеў) 12 кастрычніка выканаў свае абавязкі перад дзяржавай па збожжа і бульбапастаўках і зараз завяршае зяблівае ворыва.

Кантаровіч.

305 пудоў збожжа і 375 пудоў бульбы атрымае калгаснік Скутаў.

Свята ўраджаю і калектывізацыі наш калгас ІМЯ ЯРАСЛАЎСКАГА, Замастоцкага сельсовета сустракае поўным ВЫКАНАННЕМ ПЛАНАЎ ЗБОЖЖА І БУЛЬБАПАСТАВАК І ЗАВЯРШЭННЕМ АСНОЎНЫХ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ.

Калгас здаў па пастаўках 72,3 цнтн. збожжа і 187,5 цнтн бульбы і гэтым канчаткова разлічыўся з дзяржавай. Па ацэнцы пунктаў Загатзбожжа і Плодагароднiны зданыя збожжа і бульба высокай якасці.

Як дабіўся наш калгас гэтай перамогі?

Правільнай арганізацыяй працы па брыгадах, жаданнем усіх калгаснікаў ва ўстаноўлены тэрмін цалкам разлічыцца з дзяржавай.

Як толькі калоссі наліліся і сталі ледзь пасівеваць, распачалі мы жніво. У добрае надвор'е сушылі збожжа на полі, адразу ж арганізоўвалі кругласутачны абмалот і непасрэдна з пад малатарні возку збожжа на прыёмачны пункт.

Паспяхова мы справіліся з асноўнымі асеннімі сельска-гаспадарчымі работамі. 3 палёў убралі ўвесь ураджай, у тым ліку і бульбу. Да 20 кастрычніка канчаткова скончым усю малацьбу.

У калгасе да дня ўраджаю і калектывізацыі НЯМА НІВОДНАГА БЕСКАРОЎНАГА. Ужо зараз можна налічыць дзесяткі гаспадарак беднядкіх і серадняцкіх, якія ўзняліся да ўзроўня заможных.

Вось возмем для прыклада сем'ю калгасніка СКУТАВА АЛЕКСАНДРА, якая выпрацавала за 9 месяцаў 1202 працадні. Наш працадзень важыць 4 кіло збожжа і 5 кіло бульбы. СЕМ'Я СКУТАВА АТРЫМАЕ 305 ПУДОЎ ЗБОЖЖА І 375 ПУДОЎ БУЛЬБЫ.

Альбо возмем другую сем'ю ГАЛУБЦОВАЙ ЕФРАСІННІ, якая выпрацавала 911 працадзён. ГАЛУБЦОВА АТРЫМАЕ—228 ПУДОЎ ЗБОЖЖА, 290 ПУДОЎ БУЛЬБЫ.

Калгас стаіць на парозе ператварэння ў сапраўды большэвіцкі, а калгаснікі ў заможных.

Прысланы ў наш калгас у лік „75" рабочы фабрыкі «ДЗВІНА» комуніст т. ПРУСАКОЎ добра ўвязаўся за кіраўніцтва калгаса. Куды не глянеш у гаспадарцы ўсюды адчуваецца моцная дысцыпліна. „Старэйшы", як яго называюць калгаснікі, умела і добра кіруе гаспадаркай. Ён навучыў калгаснікаў сацыялістычным метадам працы.

Барацьба за высокі ўраджай у калгасе не мала выхавала добрых калгаснікаў-ударнікаў — сапраўдных герояў сацыялістычнага будаўніцтва.

Вось узоры таго, як трэба сумленна працаваць у калгасе, як трэба берагчы калгаснае дабро.

Калгасніца НАТАЛЬЯ ФІЛІПАЎНА СКУТАВА заўсёды перавыконвае нормы выпрацоўкі, у яе няма прагулаў. ШЧЫТАЎ ЦІМАФЕЙ у час азімай сяўбы вырабляў у дзень па дзве нормы, добра сеяў. АЛЕНІКАВА ПАШКА паказвала ўзоры работы на малацьбе. Такіх ёсць многа. Усе яны прыклад таго, як трэба работаць у калгасе.

Вось нашы дасягненні да свята ўраджая і калектывізацыі. Наша задача на далейшы час—яшчэ лепш працаваць, канчаткова знішчыць тыя недахопы, якія яшчэ у нас ёсць, па-ударнаму завяршыць зяблівае ворыва з тым, каб у будучым годзе атрымаць яшчэ больш высокі ўраджай і ператварыць наш калгас у сапраўды большэвіцкі і ўсіх калгаснікаў у заможных.

Калгаснікі: ГАЛУБЦОЎ, САЛУХІН С.

САЎЧАНКА ЯГОР ВЫКАНАЎ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ ЎСТУПІЎ У КАЛГАС.

За апошнія дні ў сувязі з праведзенай палітычна-масавай работай сярод аднаасобнікаў у калгасы Даўжанскага сельсовета паступаюць заявы аб прыёме ад працоўных аднаасобнікаў.

Так, гэтымі днямі прынят ў калгас „Інтэрнацыянал" працоўны аднаасобнік, былы маламоцны серадняк—Саўчанка Ягор. Ён выканаў свае абавязкі перад дзяржавай і з першых-жа дзён работы паказвае прыкладнасць.

ГРЫНМАН.

У АДКАЗ НА КУЛАЦКІ САБАТАЖ.

Выязная сесія народнага суда 5-га участка 10 кастрычніка слухала справу грамадзяніна вёскі Навасёлкі, Рудніцкага сельсовета, ПЛЕШЧАНКА Андрэя.

Плешчанка Андрэй ужо судзіцца не першы раз За сабатаж дзяржаўных паставак ён атрымаў 6 месяцаў прымусовых работ.

Зараз ён сам належачыя з яго дзяржаве 192 кгр збожжавых культур і 465 кгр. бульбы ўпарта не здае і агітуе ўсіх аднаасобнікаў вёскі Навасёлкі, каб не здавалі.

Суд прыгаварыў ПЛЕШЧАНКА за арганізацыю сабатажа збожжапаставак у вёскі Навасёлкі—да 6 год зняволення з высылкай у воддаленыя мясцовасці СССР.

Прысутнічаўшыя на судзе працоўныя аднаасобнікі сустрэлі гэты прысуд з вялікім задавальненнем.

У адказ на кулацкі сабатаж збожжапаставак працоўныя аднаасобнікі вёсак Навасёлкі і Кавалькі—ХЛОПЧАНКА Пётр, ХЛОПЧАНКА Марфа, ХЛОПЧАНКА Лаўрэн, ЛЕОНЕНКА Нікалай, ЗЯРОЖНІН Васіл, САЕНКА Філіп, САЎЧАНКА Фёдар, ХЛОПЧАНКА Малей, МАСКАЛЕНКА Нікалай і інш. датэрмінова выканалі гадавы план па збожжу, бульбы і інш. пастаўках дзяржаве

С. РАСКІН.

Нельга цацкацца з сабатажнікамі.

Я, працоўны аднаасобнік ДЗЕРУГІН Пётра, Задарожанскага пункта вёскі КОШЫНА, Нікалаеўскага сельсовета цалкам выканаў збожжа, бульбапастаўкі і фінансавыя плацяжы.

Мой сусед, якога я выклікаў на соцспаборніцтва ДЗЕРУГІН Зміцер таксама паследваў майму прыкладу. Ён таксама разлічыўся з дзяржавай па ўсіх абавязацельствах.

Мы, свядомыя працоўныя аднаасобнікі, ганьбім зрыўшчыкаў-сабатажнікаў збожжапаставак з нашай вёскі: ТАЧЫЛІНА Уладзіміра, СТАРАВОЙТАВА Кліма, КОРШУНОВУ Агату, ТАЧЫЛІНА Ягора, якія маюць, як і мы поўную магчымасць своечасова выканаць усе віды паставак дзяржаве

Мы рашуча патрабуем ад Нікалаеўскага сельсовета, каб ён прыняў супроць іх суровыя меры.

Нельга цацкацца з тымі, хто сабатуе дзяржаўныя заданні.

П. ДЗЯРУГІН

Задарожанскі пункт вёскі Кошына, Нікалаеўскага сельсовета.

Па-большэвіцку адзначым дзень ураджая і калектывізацыі.

Сёння свята большэвіцкага ўраджаю і калектывізацыі—дзень падвядзення вынікаў нашых перамог у галіне калгаснага будаўніцтва ў барацьбе за высокі сацыялістычны ўраджай, за ператварэнне ўсіх калгасаў у сапраўды большэвіцкія і ўсіх калгаснікаў у заможныя, дзень баявой мабілізацыі рабочых, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на новыя перамогі ў калгасным будаўніцтве.

Праграмныя гістарычныя прамовы нашага правадыра і настаўніка т. Сталіна, рашэнні студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) з'яўляюцца сцягам нашай барацьбы за большэвіцкія калгасы, за заможнае і культурнае—калгаснае жыццё.

Значных поспехаў на гэтым шляху за апошні год дасягнула Віцебшчына. Ужо не мала ў нас у раёне ёсць такіх калгасаў, якія на справе ператвараюцца ў большэвіцкія, а калгаснікі упэўнена стаяць на подступах да заможнага жыцця Немала ў нас ужо ёсць калгаснікаў-ударнікаў, якія аддана змагаюцца за задачы пастаўленыя партыяй у калгасным будаўніцтве.

Хіба не героем нашай калгаснай Віцебшчыны з'яўляецца Раўкоў Якуб з калгаса «Чырвоная армія» які ўзброіўшыся ўказаннямі тав Сталіна працуе не шкадуючы сваіх сіл Гэта-ж пры яго непасрэдным удзеле калгас становіцца моцнай гаспадарчай адзінкай. Растуць узросшыя культурныя запатрабаванні калгаснікаў. У калгасе ўжо ёсць электрычнасць, складаныя машыны, калгаснікі забяспечаны збожжам, бульбай і гароднінай, атрымаюць звыш 2 руб грошай на працадзень Усе калгаснікі калгаса «Чырвоная армія» пісьменныя. Моцнае фінансавае становішча калгаса дазваляе калгаснікам высоўваць смелую думку, якая ўжо ператвараецца ў жыццё: пабудаваць 6 двухпавярховых дамоў, клуб, добраабсталяваную сталоўку, розныя дзіцячыя установы. Хіба ўсё гэта не красамоўнае паведчанне ўзросшага матэрыяльнага і культурнага ўзроўня нашага калгасніка?

СКУТАЎ АЛЯКСАНДР З КАЛГАСА ІМЯ ЯРАЎСЛАЎСКАГА, ЗАМАСТОЦКАГА СЕЛЬСОВЕТА АТРЫМАЕ 305 ПУДОЎ ЗБОЖЖА І 375 ПУДОЎ БУЛЬБЫ, не лічачы сена, саломы, гародніны, грошай і інш. прадукцыі. Вось доказ, які з'яўляецца бліскучым падцверджаннем геніяльнасці слоў тав. Сталіна аб цудах калгаснага будаўніцтва, калі на чале калгасаў стаяць сапраўдныя большэвікі, калі калгаснікі працуюць сумленна. Вось доказ, які з'яўляецца жывым агітатарам усіх пераваг калгаснага жыцця.

Немала ў нас у раёне калгасаў, дзе працадзень важыць 3-4-5-6 кілограм збожжавых, 8—10—12 і больш кілограм бульбы, ды плюс яшчэ грошы, гароднiна, сена, салома, сілас і г. д.

Узрастае свядомасць калгаснікаў, якія калгасныя інтарэсы ставяць вышэй сваіх асабістых.

У актыўным балансе гэтага сельска-гаспадарчага года мы маем значнае ўзняццё ураджайнасці збожжавых (10—12 цэнт з га), паспяховае правядзенне сенакашэння і сеназдачы. Мы паспяхова справіліся з адгрузкай бульбы Ленінграду.

Але адзначаючы гэтыя дасягненні, нашы перамогі на фронце калгаснага будаўніцтва і барацьбы за высокі ўраджай, мы ні ў якім разе не можам заплюшчваць вачэй і праходзіць міма тых буйных прарываў, якія мы яшчэ і на сённяшні дзень маем.

Мы значна яшчэ адстаем ад спаборнічаючых з намі Ярцаўскім (Заходняя вобласць), Менскім і Гомельскім раёнамі, як у збожжапастаўках так і зяблівым ворыве. На 10 кастрычніка план збожжапаставак па нашаму раёну калгасна-сялянскім сектарам выканан толькі на 62,3 проц, план зяблівага ворыва толькі на 12,7 проц. Мы вельмі дрэнна яшчэ змагаемся за рэалізацыю пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб завяршэнні збожжапаставак да 15 кастрычніка, аб поўным выкананні плана зяблівага ворыва да 25 кастрычніка.

Побач з перадавымі калгасамі, як „Чырвоная армія", «Другая большэвіцкая вясна», Елагінскага сельсовета „Новы свет", Міхалёўскага сельсовета, імя Молатава, Шумнянскага, „Молат", Веліка-лётчанскага, мы маем рад калгасаў адстаючых, цягнушчыхся ганебна ў хвасце ўсіх сельска-гаспадарчых работ, і выканання сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

Фронт калектывізацыі—фронт абвастранейшай класавай барацьбы. Кулак разбіт, але яшчэ не дабіт. Класавы вораг перафарбаваўся, ён адкрыта не выступае, ён дзейнічае новымі манеўрамі, ён пралазіць у калгас і там „ціхай сапай" праводзіць сваю разбуральную работу. ЦО „Правда" з усёй большэвіцкай рэзкасцю і праматой ускрыла адзін з такіх манеўраў кулацкіх недабіткаў у БССР. Гэта вельмі характэрна і для Віцебскага раёна.

Хіба адставанне калгасаў „Другая пяцігодка", Старасельскага сельсовета і «Чырвоная зорка», Замастоцкага сельсовета ў сельска-гаспадарчых работах не тлумачыцца тым, што пралезшае кулаччо незаконна павялічыла сабе прысядзібныя ўчасткі Немала такіх прыкладаў магчыма прывесці з калгасаў Рудакоўскага, Рудніцкага і іншых сельсоветаў.

І адсюль задача-мацней і вастрэй рэвалюцыйную палітычную пільнасць у барацьбе з класавым ворагам, за ператварэнне ўсіх калгасаў у сапраўды большэвіцкія і ўсіх калгаснікаў у заможных.

У дзень ураджаю і калектывізацыі на аснове шырокага паказа пераваг і дасягненняў калгаснай вытворчасці, трэба дабіцца яшчэ большага прыліва ў калгасы працоўных аднаасобнікаў, усямерна садзейнічаючы жадаючым уступіць у калгасы беднацка серадняцкім гаспадаркам. Новы калгасны прыліў павінен быць арганізован пад знакам далейшага арганізацыйна гаспадарчага і палітычнага ўмацавання калгасаў, як цэнтральнай і рашаючай задачы.

З прылівам у калгас трэба спалучыць рашучую барацьбу за ачыстку калгасаў ад не дабітых класава варожых элементаў, за сумленнае і найхутчэйшае выкананне калгасамі і аднаасобнікамі ўсіх сваіх абавязкаў перад дзяржавай, за найхутчэйшае і высокаякаснае завяршэнне зяблівага ворыва, уборкі бульбы, апрацоўкі ільна, падрыхтоўкі да зімоўкі жывёлы і г. д.

Ніякага адмежавання, замкнутасці калгасаў ад працоўных аднаасобнікаў не павінна быць, бо гэта грае на руку толькі класаваму ворагу, які намагае ўсе сілы, скарыстоўвае ўсе сродкі, каб адштурхнуць працоўнага аднаасобніка ад калгасаў, каб перашкодзіць далейшай калектывізацыі. Ніякай цеганіны і затрымкі ў разглядзе заяў аднаасобнікаў аб уступленні ў калгас. РАЗАМ З ГЭТЫМ, ПРЫЁМ У КАЛГАСЫ ПАВІНЕН ПРАХОДЗІЦЬ НА АСНОВЕ ПЕРСАНАЛЬНАГА ПАДЫХОДА, КАБ НЕ ПРАЛЕЗ У КАЛГАС КЛАСАВЫ ВОРАГ.

Класавая пільнасць і большэвіцкае ўменне арганізаваць справу, разгортванне шырокай масавай работы сярод нашых заўтрашніх калгаснікаў, барацьба з ігнараваннем аднаасобніка, бяздушным да яго падыходам, барацьба з пагоняй за голымі лічбамі калектывізацыі—вось што вырашае поспех справы.

У дзень ураджая і калектывізацыі кожны саўгас, МТС, кожны калгас, кожная вытворчая брыгада павінны падвесці вынікі сваёй барацьбы за ўраджай, за асваенне агратэхнікі, выявіць усе недахопы з тым, каб мабілізавацца на хутчэйшую іх ліквідацыю і з поспехам рушыць наперад да новых перамог.

Дзень ураджая і калектывізацыі ставіць перад кожным калгасам, саўгасам, МТС і брыгадай неабходнасць яшчэ больш шырокага разгортвання мерапрыемстваў па далейшаму ўздыму ўраджайнасці. Ён павінен стаць паваротным пунктам у разгортванні агразоатэхвучобы. У гэты дзень кожная гаспадарка павінна закласці моцны фундамент для гэтай вучобы распрацаваць практычную праграму работы на асенне-зімовы перыяд, які павінен быць цалкам выкарыстан для сур'ёзнага і сістэматычнага вывучэння тэхнікі, вядзення буйнай сацыялістычнай гаспадаркі з тым, каб да вясны 1934 г. прыйсці больш узброенымі для барацьбы за далейшае павышэнне ўраджая.

Напружваючы ўсе сілы на неадкладнае завяршэнне збожжапаставак, здачу бульбы і ільнапрадукцыі дзяржаве, завяршэнне зяблівага ворыва, рашуча змагаючыся са спробамі класавага ворага зацягнуць і гэтым сарваць выкананне важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній разгортваючы барацьбу за сацыялістычны ўраджай і развіццё сацыялістычнай жывёлагадоўлі на аснове арганізацыйна-гаспадарчага і палітычнага ўмацавання калгасаў—дабёмся далейшага магутнага руху калектывізацыі.

У дзень ураджая і калектывізацыі яшчэ больш мабілізуем усіх рабочых, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на барацьбу за рэалізацыю пастановы бюро ЦК КП(б)Б «аб тэрмінах выканання асноўных с г. работ і загатовак сельска-гаспадарчай прадукцыі», за большэвіцкія калгасы, за заможнае і светлае калгаснае жыццё, за пяршынства ў соцспаборніцтве Віцебшчыны з Ярцавым, Менскам і Гомелем.

З ГОНАРАМ ВЫКАНАЛІ СВАЕ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ.

Калгас „НОВЫ ШЛЯХ", Даўжанскага сельсовета, 10 кастрычніка канчаткова разлічыўся з дзяржавай.

Здана жыта 58,57 цэнт., пшаніцы—0,7 цэнт., аўса—32,2 цэнт., вікі і ячменя—24,73 цэнт., бабовых—1,76 цэнт., ільнанасення—4 цэнт., бульбы—237,5 цэнт.

Калгас гэтай перамогі дабіўся дзякуючы разгортванню соцспаборніцтва і ўдарніцтва, аддансці калгаснікоў справе калгаснага будаўніцтва.

Вось нашы перадавікі, якія ўдарна работалі на малацьбе, сушцы і возцы збожжа на ссыпны пункт: Бяданава Наталля, Корпенка Б., Летчанскі Фёдар, Лобанеў Яфім, Лявоўскі Сяргей, Лявоўская Агата.

Зараз усе сілы пераключаем на ворыва, зяблева і ўборку гародніны.

Старшыня калгаса І. БАГДАНАЎ.

ПЛАН СЯЎБЫ АЗІМЫХ ПЕРАВЫКАНАН.

На 10 кастрычніка па ўсіх сектарах раёна план сяўбы жыта выканан на 101,4 проц., пшаніцы—107 проц.

Калгасы засеялі 102,7 проц. плана азімага кліна, аднаасобнікі 89,3 проц. План сяўбы па калгасна-сялянскім сектары выканан на 99,8 проц.

САБАТУЮЧЫ ЗБОЖЖАПАСТАЎКІ ГАЎРЫЛЕНКА РОБІЦЬ КУЛАЦКУЮ СПРАВУ.

(Ліст працоўнага аднаасобніка).

Усвядоміўшы ўсю важнасць выканання святых і першачарговых сваіх абавязкаў перад дзяржавай, я з першага-ж абмалота насыпаў 70 кгр. самай лепшай якасці жыта і першым з ЗАГАРАНА-АСТРАНСКАЙ сотні звёз на прыёмачны пункт.

Праз некалькі дзён нагрузіўшы 130 кіло буйнай бульбы, канчаткова разлічыўся з дзяржавай па абавязковых пастаўках.

У гэты-ж самы час я ўплаціў усе плацяжы, прылічваючыяся з мяне. Так што даўгоў дзяржаве за мной не засталося ніскольві.

Пасеяў я 0,75 га ільну. Намалаціў 6 пудоў ільнонасення, палову ільна разаслаў, а другую палову буду расцілаць гэтымі днямі.

Валакна трэба здаць мне 6 пудоў. Пойдзе ён ў мяне не ніжэй 10 нумару, так я цвёрда парашыў сабе, бо лён на сцелішчы вельмі ўдалы Высокі, валакністы. Пакуль другая палова вылежыцца я не буду чакаць, а адразу прымуся за сушку, мяцце і трапанне яго і не пазней 20 кастрычніка першыя 3 пуды ільновалакна будуць здадзены.

Ёўня мая падрыхтаваная, дровы падвезены, хоць ты сёння затапляй і сушы. Чакаю толькі пакуль вылежыцца.

Да 10 лістапада здам дзяржаве ўвесь лён, што прылічваецца з мяне.

Буду імкнуцца здаць ЛЕПШАЙ ЯКАСЦІ, бо ведаю, што за лён дзяржава дае хлеб.

З лёнам я спраўлюся не горш, як з астатнімі культурамі. У гэтым я ўпэўнен.

Мой сусед ІВАНОЎ ЗМІТРОК з Астран гледзячы на мяне таксама стаў падцягвацца Сёння ён даважвае бульбу, якая з яго прылічваецца, таксама поўнасцю разлічыцца з дзяржавай.

А вось у Касцараве жыве аднаасобнік ГАЎРЫЛЕНКА КАРНЕЙ, якога інакш, як кулацкім сабатажнікам назваць нельга. У чалавека поўныя засекі збожжа, поўны ток бульбы, а свае абавязкі перад дзяржавай не выконвае, спасылаючыся, «што у яго сыры хлеб». У той-жа час ёўню, якая у яго ёсць ён для сушкі збожжа не скарыстоўвае.

Чыю ж ён справу робіць? Вядома не нашу, а справу ворага кулака, бо кожны фунт не зданага хлеба—гэта ўдар па нашай дзяржаве. А з за такіх сабатажнікаў, як Гаўрыленка, пляма ганьбы кладзецца на ўвесь сельсовет. Сельсовет павінен мацней за гэту справу ўзяцца, зламаць кулацкі сабатаж, бо нельга надалей цярпець гэткае становішча.

Працоўны аднаасобнік вёскі Астраны, Рудніцкага сельсовета ВУРГАНАЎ КАСЦЮК.

Беспакаранна псуюць лён.

Першапачатковая апрацоўка ільна ў брыгадзе № 2 калгаса «БЯРОЗА», Вяліка-лётчанскага сельсовета, зрываецца.

Выцерабленны лён замест таго, каб абмалаціць і разаслаць, брыгадзір ШЫЛКОЎ звальвае ў вялікія кучы, дзе ён псуецца, вылежваючы тыднямі.

За такія адносіны да апрацоўкі ільна Шылькоў павінен быць сурова пакаран.

Калгаснік ВОСІПАЎ.

БУЙНАЯ ПЕРАМОГА САВЕЦКАГА ПАРАШУТЫЗМА.

Лётнік Яўсееў пабіў сусветны рэкорд скачка з парашутам.

10 кастрычніка старэйшы лётнік навукова-даследчага інстытута ВВС РСЧА тав. ЯЎСЕЯЎ паставіў сусветны рэкорд зацяжнога скачка з парашутам. Ён пакінуў самалёт на вышыні 7200 метраў і за час вольнага падзення ў 132,5 секунды пакрыў адлегласць 7.050 метраў і толькі на вышыні да 150 метраў ён раскрыў свой парашут.

ТАКІМ ЧЫНАМ ПАСТАЎЛЕНЫ НОВЫ СУСВЕТНЫ РЭКОРД ЗАЦЯЖНОГА СКАЧКА І ЎСЕСАЮЗНЫ РЭКОРД ВЫСОТНАГА СКАЧКА З ПАРАШУТАМ.

ПРЫЗЫЎ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ ПЕРШАГА ГОДА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ СКОНЧАН.

УЗОРНА ПРАВЯДЗЕМ ПРОВАДЫ ПРЫЗВАНЫХ У РСЧА.

Нашы далейшыя задачы.

З вялікім уздымам, арганізавана прайшла па раёну важнейшая палітычная кампанія—прызыў першага года другой пяцігодкі. На раду прадпрыемстваў (фабрыка імя К. Цэткін, „Прафінтэрн" і інш.) была праведзена вялікая масава-падрыхтоўчая работа з прызыўнікамі, якія бралі на сябе канкрэтныя самаабавязацельствы па выкананні прамфінплана, падрыхтоўцы праз шэфства кваліфікаванай змены на прадпрыемстве па наладжванні абароннай работы.

Прызыў суправаджаўся чырвонымі абозамі збожжа і бульбы, перавыкананнем прамфінплана, уноў арганізаванымі брыгадамі імя прызыва 1911 года нараджэння (фабрыка «Прафінтэрн», „Сцяг індустрыялізацыі"). Прызыўную камісію праходзілі сапраўдныя ўдарнікі калгасных і заводскіх будняў, комуністы, комсамольцы, беспартыйныя ўдарнікі з вялікім аб'ёмам агульна-адукацыйных, палітычных і тэхнічных ведаў, механікі, слесары, электраманцёры, педагогі, шоферы і інш., якія дадуць вялікую карысць Чырвонай арміі.

Як правіла, прызыўнікі на пункт прыходзілі бадзёрымі, вясёлымі, жыццярадаснымі. Яўка была поўная, акуратная. На самім пункце было наладжана належнае абслугоўванне—добрая сталоўка, буфет, парыкмахерская, стралковы цір, на агітпункце—чытальня, кіоск і інш. Штодзённа з прызыўнікамі праводзілася палітмасавая работа аб міжнародным становішчы і задачах прызыва. Ідучы з прызыўнога пункта на прадпрыемства, і калгас, прызыўнікі абавязваліся перадаць усё тое, што атрымана імі на пункце.

Прызыўнікі самі дапамагалі камісіі выкрываць чужакоў, якія абманным шляхам усімі сіламі стараюцца пралезці ў рады Чырвонай арміі. Так пры дапамозе прызыўнікаў выяўлены класава варожыя ГІНЗБУРГ—сын пазбаўленца—гандляра, САПГІР, — сын б. фабрыканта і інш.

Перад уходам у рады РСЧА, прызыўнікі бралі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па выкананню плана, па шэфству над маладымі рабочымі і наладжванню асоавіяхімаўскай работы. Задача зараз заключаецца ў тым, каб забяспечыць стопрацэнтнае выкананне кожнага абавязацельства. Застаўшыйся да ўхода ў Чырвоную армію час прызыўнікі павінны скарыстаць для пацнацця сваіх ваенных ведаў, агульнай адукацыі і ліквідацыі малапісьменнасці. БЫЦЬ ДА ДНЯ ЎХОДА Ў РСЧА ЛЕПШЫМ УДАРНІКАМ ВЫТВОРЧАСЦІ — СПРАВА ГОНАРА КОЖНАГА ПРЫЗЫЎНІКА.

Прызыў скончан. Перад фабрычна-заводскімі арганізацыямі, сельсоветамі, калгасамі задача—арганізаваць узорныя провады сваіх прызыўнікаў, падрыхтаваць на іх месца кваліфікаваную замену, каб не дапусціць прарыва на ўчастку, працэсе, умацаваць сувязь з падшэфнымі часткамі Чырвонай арміі, ахапіць кожнага прызыўніка учобай, наладзіць добрае абслугоўванне і патрэбную дапамогу сем'ям прызваных. Чырвонаармейцам першага года другой пяцігодкі—вартыя провады ў рады Чырвонай арміі.

НА ВІЦЕБСКІМ ПРЫЗЫЎНЫМ ПУНКЦЕ.

Пуцёўка ў Чырвоную армію ўручана.

Быць тэхнічна-пісьменным байцом.

Школа шофераў па-баявому рыхтавалася да прызыва. Была праведзена шырокая масава-растлумачальная работа аб задачах прызыва 1933 года, для маючыхся 11 прызыўнікаў быў арганізаван спецыяльны вайсковы гуртэк (па-за плановых заняткаў). Прызыўнікі яшчэ вывучалі і бронямашыну.

Ідучы ў рады Чырвонай арміі, я бяру на сябе абавязак замацаваць і паглыбіць дасягнутыя мною веды ў арганізаваных гуртках, быць тэхнічна-пісьменным і прыкладным байцом.

Курсант вопытна-паказальнай школы шофераў прызыўнік ВІОМІН.

У сваёй рабоце не ведаў прарываў.

У 1928 годзе Канстанцін ПУМПУР скончыў вучобу і паступіў тэлеграфным рабочым на паўночна-заходнюю чыгунку. У 1929 яго пераводзяць у старэйшыя рабочыя і праз год, улічваючы старанасць, сур'ёзную вучобу і павышэнне тэхнічных ведаў—у электрамеханікі. Ва ўсёй рабоце Пумпура адчуваецца сумленнасць, старанасць, рацыяналізатарская думка. Недарма яго два разы прэміравалі на вытворчасці і адзін раз за паспяховую вучобу на дапрызыўнай падрыхтоўцы.

— У маёй рабоце,—гаворыць прызыўнік ПУМПУР,—я не ведаў прарываў, работаў сумленна і акуратна. Буду няўхільна авалодваць ваеннай тэхнікай і сумленна выконваць усе ўскладзеныя на мяне пачэсныя задачы ў радах Чырвонай арміі.

ДЗЯНІСАЎ.

Чужаку пуцёўка не даецца.

Не па нутру ЛАПІСАВУ калгас. У калгасе нутро большэвіцкае. У Лапісава—рвацка-кулацкае. Недарма ён дэзэртыруе з калгаса, прымайстроўваецца работаць на будаўніцтве. Як дэзэртыра калгаснай вытворчасці яго выключаюць з комсамола. Твар Лапісава становіцца яшчэ больш яскравым, калі ўлічыць, што яго бацьку разам з братамі цвёрдазаданнікамі у 1932 г. выключылі з калгаса за разлагаючую работу.

Сёння Лапіса з мястэчка Калышкі, Лёзнянскага раёна, прыйшоў атрымаць пуцёўку ў Чырвоную армію. Ці не яскрава, што ён яе не атрымаў, прызыўной камісіяй чужак Лапісаў адсеян.

ДЗЯНІСАЎ, ФЛЯЎМЕНБАЎМ.

Усе паравознікі брыгады будуць членамі Асоавіяхіма.

Я кандыдат партыі, работаю машыністам магутнага паравоза Э—90 Зрываў спаранай не маю, з эканомію 8 проц. апала, дробны рамонт праваджу сваімі сіламі, у парадку выканання самаабавязацельства. Калі вытвараецца буйны рамонт у дэпо—я заўсёды прысутнічаю, сачу за якасцю яго. Ваенную падрыхтоўку прайшоў на „добра". Вось з такімі паказальнікамі я прышоў у прызыўную камісію.

Да ўхода ў часць абавязуюся перадаць свой вытворчы вопыт сваёй паравознай брыгадзе, ахапіць яе цалкам членствам Асоавіяхіма, у радах РСЧА па-большэвіцку змагацца за авалоданне ваеннай тэхнікай, каб у патрэбны момант па закліку партыі і ўрада даць руйнуючы адпор ворагам.

Прызыўнік ДРЭВІН.

У гонар прызыва арганізавалі чыстку наборных кас.

У гонар прызыва я, як партыец, сакратар комсамольскай ячэйкі ДРУКАРНІ «КОМІНТЭРН» арганізаваў комсамольцаў і беспартыйную моладзь на чыстку кас, якая значна ўзнімае прадукцыйнасць працы. Па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі, у друкарні арганізаваны 2 маладзёжныя брыгады, якія перавыконваюць ужо свае вытворчыя заданні. Сваю норму я, як правіла, перавыконваю на 20-25 проц. Дапрызыўную падрыхтоўку прайшоў на „добра", асабліва па стральбе.

Прызыў у Чырвоную армію—для мяне з'явіўся вялікім святам, бо мне пролетарыятам давяраецца адказнейшая справа—ахова межаў СССР. Буду вучыцца на Чырвонага камандзіра.

КАЖЭЎНІКАЎ.

Рыхтую сабе кваліфікаваную замену.

Рыхтуючыся да прызыва ў РСЧА, я абвясціў сябе ўдарнікам на сваім участку работы. Калі раней у мяне сустракаўся брак, то за апошні час я яго зусім знішчыў. Гэта дасягнута ў рэзультаце выканання заключанага социялістычнага дагавора з брыгадай старэйшага аглядчыка Рутkоўскага. Ваенную падрыхтоўку я прайшоў на „добра".

Да ўхода ў Чырвоную армію бяру абавязак падрыхтаваць на сваё месца суседняга, мена кваліфікаванага рабочага.

Слесар пасты агляда дэпо прызыўнік МІРОНАЎ.

НА ВІЦЕБСКІМ ПРЫЗЫЎНЫМ ПУНКЦЕ

У час перапынка работы камісіі скокі пад гармонік.

ПРЫЗЫЎНІКУ—УВАГА І КЛОПАТЫ.

Да суровай адказнасці вінаватых у нячулых, бюракратычных адносінах да прызыўнікаў.

Друкуемыя ніжэй матэр'ялы сведчаць аб фактах бюракратызма ў адносінах да прызыўнікаў з боку кіраўніцтва больніцы імя Калініна і праўлення ЗРК фабрыкі „Дзвіна". Апошняя груба парушыла закон, звольшы прызыўніка Тарлецкага без усякіх падстаў з работы.

Мы патрабуем неадкладнага прыцягнення да суровейшай адказнасці вінаватых у нячулых, бюракратычных адносінах да прызыўнікаў.

„З ПРЫЧЫНЫ ЎХОДА Ў ЧЫРВОНУЮ АРМІЮ"...

(Ліст прызыўніка).

З пачатку 1932 года я работаю ў ЗРК фабрыкі „Дзвіна" ў якасці сакратара праўлення. Ударнік, за сваю работу быў прэміраван. Прызыўной камісіяй прыняты у рады Чырвонай арміі і прызначан да яўкі ў часць 9 лістапада.

Праўленнем ЗРК фабрыкі „Дзвіна" пад дыктоўку загадчыка гандлёвага аддзела Пагоскіна ні з таго, ні з сяго замест мяне прысылаецца свой для Пагоскіна чалавек—Федараў. І мяне 11 верасня звальняюць з работы з „матывіроўкай": «З прычыны ўхода ў Чырвоную армію». Мне аплачваюць кампенсацыю за два тыдні, папярэдне прымусіўшы мяне напісаць заяву аб аплаце і справа як-бы гладкая.

Пасля ўмяшацельства гаркома саюза дзяржкаапераці да 6 кастрычніка мне далі часовую работу ў праўленні ЗРК, а зараз я зноў без работы.

Прызыўнік ТАРЛЕЦКІ.

БЮРАКРАТЫ ЗАДМІНІСТРАЦЫІ БОЛЬНІЦЫ ІМЯ КАЛІНІНА.

Прызыўной камісіяй накіроўваліся ў больніцу імя Калініна на выпрабаванне прызыўнікі, якія звярочваліся, як правіла, у камісію... ў рваных паліто. Гэтымі днямі камісіяй былі пасланы на выпрабаванне прызыўнік Хамцоў. Яго паліто павесілі ў кладоўцы. Пры ўходзе з больніцы Хамцову падалі тое-ж паліто, але ўсё зрызанае пацукамі. Хамцоў звярнуўся да загадчыка складам. Апошні, пасмяяўшыся над ім, заявіў: «Ідзі куды хочаш і скардзіся». Прызыўнік звярнуўся да загадчыка больніцы і атрымаў адказ: «Паладзце, а мы ўплоцім вам за гэта, а не хочаце, дык ідзіце адсюль, калі ласка».

За злачынную нядбайнасць і бюракратычныя адносіны да прызыўнікаў, працоўнікаў больніцы трэба прыцягнуць да суровай адказнасці.

Д.

Сталінскі паход за арганізаваную сустрэчу зімы.
2 МАРШРУТ:
Снабжэнне рабочых гароднінай і бульбай, сталоўкі.

Да агульнагарадской канферэнцыі кухараў і рабочага кантроля.

Шырэй разгарнуць падрыхтоўку на прадпрыемствах і ў сталовых.

ДАБ'ЕМСЯ КАРЭННАГА ПАЛЯПШЭННЯ РАБОТЫ ЦЭХАЎ ХАРЧАВАННЯ.

ТЭМПЫ ПАДРЫХТОЎКІ ДА КАНФЕРЭНЦЫІ КУХАРАЎ І РАБОЧАГА КАНТРОЛЯ НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫЯ.

8 кастрычніка адбылася нарада старшых кухароў, старшынь мясцкомаў сталовых па пытанні аб падрыхтоўцы да агульна-гарадской канферэнцыі кухароў і рабочага кантроля. Гэтая нарада паказала, што тэмпы падрыхтоўкі яўна невыстарчальныя. На нарадзе выявілася поўная недаацэнка з боку большасці фабрычна-заводскіх камітэтаў справы паляпшэння грамадскага харчавання. Аб гэтым сведчыць ўжо той факт, што на нарадзе павінны былі прысутнічаць усе старшыні ФЗМК, а прысутнічалі толькі два старшыні фабзаўкома (голкавая фабрыка і панчошная імя К. Цэткін). Зусім слаба ідзе падрыхтоўка да канферэнцыі на швейнай фабрыцы „Прафінтэрн". Там і мясцком (старшыня СВІРЭУНОЎ) і фабком (старшыня ГАДАСКІНА) не разгарнулі масавой работы сярод работнікаў сталовай і рабочых фабрыкі. Адміністрацыя гэтай сталовай не разгортвае самазагатовак, рабочы кантроль не арганізован. Не лепш справа і на скурзаводзе, дзе яшчэ на сёнешні дзень не ўведзена паблюдная сістэма.

Лепш абстаіць справа з падрыхтоўкай да канферэнцыі ў сталовай фабрыкі «Дзвіна», тут падрыхтоўка ідзе пад знакам разгортвання соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Мясцком, узначальвае творчы ўздым работнікаў сталовай. Неабходна, каб вопыт сталовай фабрыкі „Дзвіна" быў шырока падхоплен усімі сталовымі.

ЦСПСБ разам з газетай «Рабочий» абвясцілі сталінскі паход за арганізаваную сустрэчу зімы. У гэтым паходзе другі маршрут састаіць у тым, каб палепшыць снабжэнне рабочых гароднінай і бульбай і палепшыць работу сталовых. Падрыхтоўка да канферэнцыі павінна цесна ўвязвацца з праявдзеннем сталінскага пахода. Нашы сталовыя, як важныя цэхі прадпрыемстваў павінны прыйсці да зімы ў поўнай гатоўнасці.

Гарпрафсовет павінен неадкладна паставіць пытанне аб тых старшынях ФЗМК, якія ігнаруюць справу грамадскага харчавання і забяспечыць шырокае разгортванне работы усімі ФЗМК па падрыхтоўцы да канферэнцыі.

Шырэй размах падрыхтоўкі да агульна-гарадской канферэнцыі кухароў і рабочага кантроля, падрыхтуем сталоўкі да зімы, зробім іх сапраўды ўзорнымі.

Петр Хабараў.
Старэйшы кухар сталовай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі».

ПАКОНЧЫМ З АДСТАВАННЕМ НАШАЙ СТАЛОВАЙ.

Работаю я ў сталовай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» з 18 верасня. Мяне паслалі ў гэтую сталовую для ўзмацнення яе работы, як спецыяліста.

З чым я сустрэўся па прыходзе ў сталовую з першых-жа дзён? Першае і асноўнае, што кінулася ў вочы—гэта бруд і антысанітарыя. Я пачаў з навядзення ў сталовай і на кухні чыстаты. Дзейнічаў я шляхам растлумачэння сярод работнікаў, што ў сталовай павінна быць чыста, што неабходна клапаціцца за чыстату так, як ва ўласнай кватэры. Урэшце, я пачаў патрабаваць ад кухонных работнікаў, каб яны ажыццяўлялі санітарны мінімум. У гэтай галіне мы ўжо дабіліся першых поспехаў: палепшылася санітарнае становішча і сталовай і кухні, стала нейк прыемней работаць.

Аднак, я павінен адзначыць, што за апошнія дні абеды ў нас сталі дрэнныя, «стандартныя».

Чаму гэта так? Трэба памятаць, што падрыхтаваць добраякасны, смачны, сытны абед залежыць ад нас саміх, ад нашай гаспадарчай ініцыятывы і клапатлівасці. А ў нашай сталовай вышла так, што для абеда ёсць адна толькі бульба. Адміністрацыя сталовай на працягу верасня не загатовіла ніводнага кілограма прадуктаў у парадку самазагатовак. Хаця наша фабрыка прымацавана да Клімавіцкага раёна па правядзенні самазагатовак, але ў гэтым раёне няма нават загатавіцеляў ад сталовай. Такім чынам атрымоўваецца, што нашы гаспадарнікі чакаюць пакуль прадукты будуць самі ляцець у кацёл. Няма адпаведнай зацікаўленасці і ў фабрычных арганізацый, у першую чаргу ў фабкома. Апошні нават не арганізаваў рабочага кантроля, не змагаецца за паляпшэнне работы сталовай.

Я, як старэйшы кухар, паставіў перад сабой задачу палепшыць работу сталовай, рыхтаваць для рабочых сытны і добраякасны абед, які дапамагаў бы выкананню прамфінплана. Я—кухар стары, за маімі плячыма 32 гадовы вытворчы стаж, увесь свой вопыт я накірую на тое, каб выканаць пастаўленую задачу. Я намеціў рад мерапрыемстваў па правядзенні механізацыі і рацыяналізацыі самой кухні і справы падачы абедаў, і чакаю ад нашай адміністрацыі і заўкома сапраўднай падтрымкі, аказання мне дапамогі.

У парадку падрыхтоўкі да канферэнцыі кухароў і рабочага кантроля, да 16-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі я выклікаю на соцспаборніцтва старэйшага кухара фабрыкі „Дзвіна" САКОЛЬСКАГА на лепшае і добраякаснае рыхтаванне абедаў. Сваё спаборніцтва я буду весці пад знакам таго, каб дабіцца ператварэння сталовай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» да 16-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў сапраўды ўзорную сталовую.

Галіна Шыенак.
Старшыня мясцкома работнікаў сталовай фабрыкі „Дзвіна".

ЯК МЫ РЫХТУЕМСЯ ДА ГАРАДСКОЙ КАНФЕРЭНЦЫІ КУХАРАЎ І РАБОЧАГА КАНТРОЛЯ.

Шырока разгарнулася ў нашай сталовай падрыхтоўка да гарадской канферэнцыі кухароў і рабочага кантроля. У аснову ўсёй нашай падрыхтоўчай работы пакладзена ўмацаванне соцспаборніцтва і ўдарніцтва сярод работнікаў сталовай. У час падрыхтоўкі ў нас арганізаваны дзве ўдарныя брыгады—адна брыгада імя КІМ—на кухні, у якую ўваходзяць ударнікі: ЕРАМЕНКА, ПРУДНІКАВА, ПАШКЕВІЧ, ГАЕЎСКІ і другая брыгада афіцыянтак у складзе ўдарніц: ПАТОЦКАЙ, ЕРАФЕЕВАЙ, МАКАРЭНКА, ФАМЕНКОВАЙ. Гэтыя брыгады ўступілі ў соцспаборніцтва паміж сабой на лепшае прыгатаўленне абедаў і абслугоўванне рабочых. На 1 кастрычніка ў нас налічваецца 62 ударніка з 70 работнікаў сталовай.

Мы дабіліся таго, што ў нас штодзённа працуе бракеражная камісія, абеды своечасова правяраюцца камісіяй, і іх якасць заносіцца ў бракеражную кнігу. У нашай сталовай існуе паблюдная сістэма. Вось, прыкладна, 4 кастрычніка меню складалася з наступных блюд: боршч чырвоны 14 кап., запяканка бульбяная 16 к., грыбы з бульбай 28 к., гуляш з бульбай 40 кап., пюрэ бульбянае з гуркамі 22 к. 5 кастрычніка меню складалася: боршч свежы 16 к., грыбы з бульбай 23 к., тварог з бульбай 35 к., запяканка бульбяная 16 к.

Прамфінплан сталовай за трэці квартал выканан на 113 проц., за верасень прамфінплан выканан на 115 проц. Рыхтуючыся да канферэнцыі кухароў і рабочага кантроля, мы ўзялі на сябе абавязацельства замацаваць атрыманыя першыя поспехі з тым, каб надалей дабіцца рашаючых перамог у справе паляпшэння грамадскага харчавання на фабрыцы. Мы ўступаем у соцспаборніцтва са сталовай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» і будзем змагацца за тое, каб не адстаць дапамагаючы друг другу і ў той-жа час дамагчыся першынства.

Як недахоп нашай падрыхтоўкі трэба адзначыць, што фабком яшчэ сур'ёзна не заняўся арганізацыяй рабочага кантроля: апошні работае нерэгулярна і не ведае добра сваіх функцый. Слаба ў нас работае насценгазета. Мала ўдзеляе ёй увагі сакратар ячэйкі КП(б)Б Відмант.

Гэтыя недахопы нам патрэбна нахаду ліквідаваць з тым, каб сталовая прышла да канферэнцыі з лепшымі паказальнікамі ў барацьбе за добраякасны і сытны абед для рабочых.

Антысанітарыя ў санаторыі „Сасноўка".

(ЛІСТ АДПАЧЫВАЮЧАГА).

Задача санаторыі, тым больш сухотнага, заключаецца не толькі ў тым, каб лячыць хворых, але і ў тым, каб мерамі прафілактычнага парадка папярэдзіць распаўсюджванне хваробы. Між тым, у санаторыі „САСНОЎКА" гэтаму пытанню зусім не надаюць сур'ёзнай увагі. Антысанітарыя—бруд ложакаў, верхняй вопраткі, брудныя пляваценьніцы, а то і зусім адсутнасць іх—штодзённае з'явішча.

Я прыехаў у санаторыю «САСНОЎКА» 18 верасня. Выдалі мне разам з іншай санаторнай вопраткай бруднае, не быўшае ў дэзінфекцыі асенняе паліто, а калі я стаў супярэчыць і хацеў апрануць сваё паліто, то мне сказалі, што гэтага рабіць нельга, за гэта выпішуць з санаторыі.

Не ў лепшым становішчы знаходзяцца і пасцельныя прылады. Цёплыя коўдры брудныя, па некалькі месяцаў не бываюць у дэзінфекцыі. Пасцельную бялізну мне змянілі толькі на 17 дзень майго прабывання. Гэты выпадак са мной не з'ўляецца выключэннем.

Калі да гэтага дабавіць, што ў пакоях хворых пляваценьніцы стаяць па 4—5 дзён не вымытымі, а вакол санаторыі і ў санаторным клубе іх амаль зусім няма, што прымушае хворых пляваць на падлогу, то атрымліваецца малюнак ператварэння санаторыі ў ачаг антысанітарыі.

Кіраўніцтва санаторыі ў асобе галоўурача т. ЗЫСКОВІЧА на гэта ніякай увагі не звярачвае. На заўвагі хворых т. Зыскович дае адказ: «Вы хворыя, і не ваша справа ўмешвацца ў мае функцыі».

К. ЧАПЛІНСКІ.

АД РЭДАКЦЫІ:

Чакаем ад гарздраўаддзела хуткага рэагавання на сутнасць ліста і прыцягнення вінаватых у антысанітарным становішчы санаторыі да суровай адказнасці.

Квартчасць разбазарвае хлеб.

(ЛІСТ РАБОЧАГА)

Дрэнна пастаўлена работа стала пайнікаў квартчасці пры УВСР-98 (загадчыца Сербіна). Большасць рабочых на ўлік не ўзяты, а ім выданы харчовыя карткі і прытым без паявой кніжкі. Паёк у ЦРК рабочыя атрымліваюць па гэтых-жа картках квартчасці. Апрача таго, што па гэтых картках выдаюць па 600 гр хлеба, выдаюць яшчэ дадаткова сезонкі. Выходзіць, што рабочы квартчасці незаконна карыстаецца лішнімі пайкамі. Так атрымліваюць Шруцкая, Капноўская, Фогельсон, Муніц і інш.

Ці ведае аб гэтым гарснаб?

ШРУБІК.

АД РЭДАКЦЫІ.

„Віцебскі пролетарый" аб фактах разбазарвання рабочых кантынгентаў неаднаразова пісаў. Аднак, разбазарванне хлеба ўрадзе месц працягваецца. Пракуратура павінна прыцягнуць вінаватых да суровай крымінальнай адказнасці.

У МТФ КАЛГАСА ІМЯ МОЛАТАВА НЯМА ГАСПАДАРЧАГА ВОКА.

(Ліст калгасніка).

У сараі, дзе стаяць каровы, брудна, ім нічога не падсцілаюць. Маладняк, ад 8 месяцаў да аднога года, па цэлым суткам не выпускаюць у поле, а толькі пояць іх.

Дрэнна з улікам малака. Прыёмшчыца малака Вурганава Ольга, пры адпраўцы малака ў горад, блытае калгаснае малако з аднаасобным. Ведамасці на выдачу малака цяжка разабраць, бо яны запэцканы, перачыркаiны. Квіткі на здачу малака даставяюцца не ўсе, у выніку чаго немагчыма дабіцца колькі здадзена малака ў лік плана. Вурганава даручанай ёй справай не цікавіцца. Яна займаецца «очковтирательством» кажучы, што «усё ў парадку, усё добра».

Г. ПРЫВАРЫН.

АД РЭДАКЦЫІ.

Чакаем тэрміновага паведамлення ад загадчыка МТФ, што ім зроблена для наладжвання работы.

Па слядах лістоў.

Парушальнікі працдысцыпліны пакараны.

Пад загалоўкам „Знішчыць элементы расхлябанасці сярод вагонаважатых" у № 233 «Віцебскага пролетарыя» быў змешчан ліст т. Алёхіна, які пісаў аб тым, што вагонаважатыя Лапухова, Шаўрова і Іванова ў час руху нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў, займаюцца размовамі, чым ствараюць пагрозу бяспечнасці руху.

У адказ на гэты ліст, дырэктар трамвая т. Фельдман паведаміў рэдакцыю, што Лапухова, за нядбайныя адносіны да работы і размовы ў час руха—знята з работы. Івановай, за грубыя адносіны да пасажыраў вынесена суровая вымова з папярэджаннем. Факт парушэння працдысцыпліны з боку Шаўровай не пацвердзіўся.

Змешчаны ў газеце матэр'ял абгаварваўся на зменавых сходах работнікаў трамвая. Унесены рад рацыяналізатарскіх прапаноў па паляпшэнню трамвайнага руху.

Забяспечыць своечасовую адгрузку лесаматэрыялаў звышударным будоўлям.

Ліквідаваць прарыў у пагрузцы лесаматэрыялаў.

Пункт Захадсплаўлеса (Чэпіна) за 9 дзён кастрычніка план пагрузкі лесаматэрыялаў выканаў толькі на 70 проц. Трэба было пагрузіць 8041 кубаметраў, пагружана 5627.

Чым выклікан прарыў у выкананні плана пагрузкі леса? Па-першае тым, што чыгуначны транспарт не падае неабходнай колькасці вагонаў пад пагрузку. Па-другое, на асобных участках пункта яшчэ і на сёння работа не перабудавана, яшчэ і на сёння работа ідзець дрэнна. Прычынай гэтага з'яўляюцца: безадказныя адносіны да механізмаў, адсутнасць планава-папераджальнага рамонта, дрэнная якасць самаго рамонта, парушэнні працдысцыпліны.

На барацьбу з канкрэтнымі вінаватымі ў дрэннай рабоце не мабілізавана ўся маса рабочых пункта. На пункце існуе сямейнасць — імкненне „не псаваць добрасуседскія адносіны". Гэта асабліва выявілася на пашыраным пасяджэнні рабкома, дзе абгаварваліся вынікі выканання плана за першыя дні кастрычніка. Куды варта выступленне, напрыклад, адказнага за механізмы тав. КАЗАКА? Тав. Казак выступае на пасяджэнні расказвае аб агідных фактах псавання лябёдак і не называе ніводнага канкрэтнага вінаватага па імя і прозвішчы.

А справа з лябёдчамі надзвычайна простая. Тыдзень таму назад лябёдка № 3 цэлы дзень мела прастой па віне слесароў ПІРАЖКОВА і СЦЕПАНЮКА. Яны дрэнна загналі ўтулку ў барабан лябёдкі і ўтулка зышла з месца. Прышлося разабраць лябёдку і зноў заганяць утулку. Апрача гэтага, на лябёдку нагрузілі бярвенні больш п ложанай нормы і бярвенні цягнулі не па пакатах, а проста па зямлі. Ведалі ж тт. Піражкоў і Сцепанюк, што гэтага рабіць нельга. Ведалі, бо яны вопытныя працаўнікі. Чаму тав. Піражкоў і тав. Сцепанюк дапусцілі псаваць лябёдку, калі тут дарага кожная мінута? Гэта яскрава сведчыць аб тым, што Піражкоў і Сцепанюк безадказна не добрасумленна адносяцца да даручанай ім работы.

Два дні таму назад згарэў падшыпнік у матары. Электраманцёр т. ГУРОЧКА паставіў матор, і раней чым пусціць яго ў ход, не наліў масла. У рэзультаце—згарэў падшыпнік. Гурочка за гэта звольнен. Але гутарка павінна ісці не толькі аб Гурочка. Нядбайныя адносіны да механізмаў пачалі ўваходзіць на пункце ў звычку. Рад выказваўшыхся на пасяджэнні рабкома таварышоў адзначылі, што рабочыя не ведаюць машын, не ведаюць як з імі абыходзіцца, не аўладалі тэхнікай. А што прымае рабкам (старшыня т ШПУНГІН) для ўкараненне тэхмінімума? Нічога. Нічога не прымае і кіраўніцтва пункта сплаўлеса на чале з т. ЗОТАВЫМ.

Паломкі, псаванне механізмаў—амаль штодзённа. А чаму? Таму, што майстры тт. МІХАЙЛАЎ, НОВІКАЎ, ГЕРШАНАЎ і інш, якія ў першую чаргу адказваюць за механізмы, нядобрасумленна адносяцца да сваіх абавязкаў, не правяраюць механізмы перад пускам іх у работу.

Не знішчаны і парушэнні працдысцыпліны, асабліва сярод механікаў. Чамусьці тав КАЗАК у сваім выступленні і гэта пытанне замазаў, упарта не пажадаў называць тых, хто дэзарганізуе працу.—Паглядзіце ў табелі, там узнаеце,—адказаў тав Казак на патрабаванне назваць прозвішчы канкрэтных прагульшчыкаў і лодыраў.

Усе гэтыя хваробныя з'явішчы, аб якіх многа гаварылі на пасяджэнні рабкома і з'яўляюцца прычынай прарыва ў пагрузцы леса.

Біць па КАНКРЭТНЫХ вінаватых, ВЫКРЫВАЦЬ І ЗМАГАЦЦА з імі бязлітасна, рашуча, па-большэвіцку. Так павінна стаяць пытанне.

Застаўшыяся дні кастрычніка павінны на пункце быць сапраўды ўдарнымі. Звышударныя пускавыя будоўлі чакаюць леса. Ніводнай гадзіны, ні воднай мінуты лішняй не павінны гэтыя лесаматэрыялы затрымлівацца па віне пункта. Да канца кастрычніка засталося выбраць з вады, раздзяліць і падаць пад пагрузку 35000 кубаметраў лесаматэрыяла.

З усёй бязлітаснасцю трэба выкрываць і біць па канкрэтных вінаватых прарыва, устанавіць жалезную дысцыпліну на пункце.

БЕЛЬСКІ, ГЕЛЬМЕС.

Чыгунка павінна бесперабойна падаваць паражняк.

З 1 па 10 кастрычніка Чэпінскі пункт Захадсплаўлеса даў заяўку 6 раёну МББ чыгункі на 150 платформаў і 70 крытых вагонаў пад адгрузку лесаматэрыялаў для звышударных пабудоў. За гэты час раён даў толькі 70 платформаў і 61 крытых вагон.

9 кастрычніка была дана заяўка на 15 платформаў, не было падана ніводнай і адгрузка была поўнасцю сарвана.

Памочнік начальніка станцыі Віцебск па камерцыйнай часці т. Рафаловіч не забяспечвае своечасовую падачу паражняка.

8 кастрычніка было падана пад пагрузку экспартнага баласа 8 вагонаў, з якіх чатыры былі забракаваны з-за бруду (раней у гэтых вагонах перавозілі вугаль).

6 раён МББ чыгункі павінен забяспечыць згодна плана своечасовую падачу платформаў пад пагрузку лесаматэрыялаў.

ЛАНДРЭС, ШЭЎЧЭНКА.

СЕННЯ СВЯТА БОЛЬШЭВІЦКАГА УРАДЖАЯ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Вышэй сцяг барацьбы за большэвіцкія калгасы, за заможнае жыццё.

„Каб стаць калгаснікам заможнымі для гэтага патрабуецца цяпер толькі адно—работаць у калгасе сумленна, правільна скарыстаць трактары і машыны, правільна скарыстаць рабочую жывёлу, правільна апрацаваць зямлю, берагчы калгасную ўласнасць“ (СТАЛІН).

Прыходзіць жыццё заможнае, культурнае жыццё.

(Ліст калгаснікаў калгаса „Чырвоная армія“, Елагінскага сельсовета).

З 12-ці гаспадарак увясну 1930 г арганізаваўся наш калгас імя Чырвонай арміі, Елагінскага сельсовета.

З таго часу прайшло чатыры гады. Нязменна з года ў год рос калгас і зараз ператварыўся ў буйную калектыўную гаспадарку, якая яднае 182 былых аднаасобных і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Спачатку, не гледзячы на вялькасны рост, някк не ладзілася наша жыццё. Былі вялікія прарывы, дрэнна спраўляліся з работамі, не было працоўнай дысцыпліны, як звычайнае з'явішча, назіраліся сістэматычныя прагулы, познія выхады на работу.

ПАСЛЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАМОВЫ т. СТАЛІНА.

Пасля гістарычнай прамовы т. Сталіна на 1-м Усесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў, аб якой нам падрабязна расказаў удзельнік гэтага з'езда наш ударнік т. РАЎКОЎ ЯКУБ, мы зразумелі, дзе трэба шукаць прычын нашых прарываў, як наладзіць нашу работу.

На-першае, мы ўзяліся за ачыстку калгаса ад шкоднніцкіх, кулацка варожых элементаў — былі вычышчаны: былы афіцэр КАЗЛОЎ, былыя кулакі ПАТОЦКІ і НІЖНІКАЎ КАРП, КУЛІКАЎ СЦЯПАН і інш., якія займалі адказныя пасады ў калгасе і імкнуліся разбурыць яго знутры.

Ажыццяўляючы ўказанне т. СТАЛІНА мы ўсю ўвагу накіравалі на тое, каб з поспехам і ў тэрмін завяршыць веснавую сяўбу, а таксама на якасць апрацоўкі глебы. 18 га аўса засеялі за кошт звышпланавай сяўбы, не баяліся, што кулацкія падпявалы шушукалі—«згіне авёс». Цвёрда верылі партыі і ўраду—да і нашы калгаснікі-ударнікі гаварылі—„раней засеем, раней і ўбіраць будзем“, а таму веснавую сяўбу хаця і са спазненнем супроць наказаных тэрмінаў—але скончылі першымі па сельсовеце і на 25 дзён раней мінулагодняга.

Аўса засеялі 63,73 га (звыш плана 4,73 га), ячменя 34,5 (5,5 га звыш плана) і гародніны на 16 га звыш планавага задання.

Паставіўшы сваёй задачай барацьбу за павышэнне ўраджайнасці, мы вывезлі на палі 15.450 вазоў гною, 40 тон мінеральнага ўгнаення, сабрана ўнутры калгаса попелу каля 5 тон.

Была праведзена тры разы прапалка гародніны.

ПЕРАМАГЛА ДОБРАСУМЛЕННАЯ ПРАЦА.

Нашы намаганні і добрасумленная работа перамаглі. Калі ў мінулым годзе ўраджай яравых у нас быў вельмі дрэнны—3—4 цэнтн. з га, то ў гэтым годзе намалацілі ячменя 11 цэнтн., а аўса 10 цэнтн. з га. Добра ўрадзілася морква. Больш 1000 пудоў з га, капусты 700 пуд. з га.

Не гледзячы на неспрыяючае надвор'е для ўборкі—мы ўвесь ураджай сабралі своечасова і добраякасна, не далі загінуць ніводнаму каласку, для чаго арганізавалі пасля звозкі з палёў збор каласоў дзецьмі і вучнямі Альгоўскай школы.

Да абмалота прыступілі праз тры дні пасля пачатка жніва. Абмалот збожжавых скончан цалкам, засталося абмалаціць толькі тое жыта, якое прызначана для абмалота ўручную—для загатоўкі кулявой саломы на патрэбы парнікоў і рамонт дахаў.

ГАНАРЫМСЯ, ШТО ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЛІ АБАВЯЗКІ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ.

Мы ганарымся тым, што першымі па сельсовету і датэрмінова выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай. Жыта здалі 97,92 цэнтн., ячменя 21,34, аўса—50,15, бульбы 133 тоны, гародніны рознай 10,7 тоны.

Ажыццяўляючы ўказанні правадыра партыі т. Сталіна мы дабіліся значнага зруху ў перабудове нашай работы, у веснавую сяўбу аказалі дапамогу калгасам „Капачова“, імя Молатава, Бабініцкага сельсовета, калгасу „Новы шлях“ сваімі буксірнымі брыгадамі з 20 калгаснікаў і 20 коней. Прапрацавалі там 31 дзень. Свой вопыт ударнай работы мы перанеслі на палі гэтых калгасаў. На чале гэтых брыгад былі ўдарнікі Лысенка Е. і Падмазаў В.

Павышэнне працоўнай дысцыпліны, бязлітасная барацьба з прагульшчыкамі, гультаямі, падрыхтоўка да размеркавання ўраджая паміж калгаснікамі пасля выканання абавязацельстваў перад дзяржавай і засыпкі насенных фондаў далі вялікі зрух у інтэнсіўнасці і зацікаўленасці ў рабоце, значна вырасла вага працадня.

РАСЦЕ ВАГА ПРАЦАДНЯ КАЛГАСНІКА І МАГУТНАСЦЬ КАЛГАСА.

У мінулым годзе па калгасу было выпрацавана 53.000 працадзён, на адзін працадзень прыпадала адзін кілограм збожжавых культур, 4 кіло бульбы. У гэтым годзе працадзён выпрацавана па калгасу 70 тысяч, на адзін працадзень прыпадае збожжавых 1,535 кілограм і бульбы 6 кілограм. Наш калгас мае гародні ўхіл. Многа гародніны вывозілі мы рабочым горада і маем ад гэтага значны прыбытак. Арыентыровачна атрымаем на працадзень звыш 2 рублёў грашыма.

Работа па-новаму дала канкрэтныя вынікі. Побач з ростам матэрыяльнага, паляпшаецца і культурна-бытавое становішча калгаснікаў. Пабудавана памяшканне ШКМ, ёсць 4 сталых дзіцячых установы, у 40 дамах калгаснікаў праведзена электрычнасць, у асноўным ліквідавана непісьменнасць сярод калгаснікаў. Расце і гаспадарчае ўмацаванне калгаса—у бягучым годзе пабудаваны 2 новых канюшні на 80 коняй, новы амбар на 192 тоны збожжа, новы сарай для збожжа, будынак для майстэрні ШКМ. Электрыфікаваны працэсы малацьбы, рэзкі сілоса, пілавання. Электрыфікаваны кузня, амбары, свінарнік, школа, гаспадарчы двор 4 і 1 палаводчых брыгад. Заканчваецца праводка электрычнасці да кароўніка, да другой гароднай і другой палаводчай брыгады.

Фінансавае становішча калгаса настолькі моцна, што мы высунулі ўпаўне рэальнае пытанне—аб пабудове соцыялістычнага гарадка з шасці двухпавярховых жыллёвых будынкаў, клуба, сталовай, дзіцячых установ.

ЦІ МАГЛІ МЫ РАНЕЙ ДУМАЦЬ АБ ГЭТЫМ.

А ці даўно было, калі жывучы ў сваіх аднаасобных гаспадарках, мы і думаць не маглі аб двухпавярховых дамах, аб электрычнасці, аб культурным жыцці. Нас засасвалі штодзённыя клопаты: „Што будзе, калі не стане каня, калі не хопіць насення, як пратрымацца да новага ўраджая“. Згінулі праклятыя, пакутныя дні. Мы ўжо зараз гаспадары,—вялікай соцыялістычнай гаспадаркі. Мы ўпэўнены, што соцыялістычны гарадок у нас будзе.

Для таго, каб замацаваць гаспадарчы рост калгаса, каб яшчэ лепш наладзіць наша жыццё, мы зразумелі, што патрэбна ўпартая большэвіцкая работа і асабліва ў сучасны момант, па павышэнні ўраджайнасці. Таму сяўбу азімых мы скончылі, куды раней чым у мінулым годзе. 110 га жыта і 15,28 га пшаніцы пасеяна па ўгноенай, добра апрацаванай зямлі. 1 га звыш плана засеялі ў карысць эскадрыллі імя Кагановіча. На зябліва ўзаралі 47 га.

ВЫХАВАЛІ ЎДАРНІКАЎ-ГЕРОЯЎ КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА.

Поспех справы вырашаюць жывыя людзі—адданыя гэтай справе, цвёрда ўпэўненыя ў поспеху калгаснага будаўніцтва і таму на выхаванне кадраў мы звярнулі вялікую ўвагу. З радавых калгаснікаў вылучан намеснікам старшыні калгаса, член партыі, наш лепшы ўдарнік—РАЎКОЎ ЯКУБ. Большасць трактарыстаў віцебскай МТС — вылучэнцы нашага калгаса. Сярод іх ударнік АРЛОЎСКІ—важаты калоны. РАЎКОЎ, АРЛОЎСКІ — гэта не адзінкі. Калгас выхаваў многа энтузіястаў-ударнікаў калгаснага будаўніцтва, работаючых непасрэдна на калгасных палях.

Частка з іх была дэлегатамі ўсебеларускіх і раённых з'ездаў калгаснікаў-ударнікаў. Яны паказваюць прыклады працоўнай дысцыпліны, сістэматычна перавыконваюць нормы па ўсіх галінах сваёй работы, змагаюцца за ахову калгаснай маёмасці.

Наш лепшы конюх Раўкоў Міхась заваяваў права быць дэлегатам на ўсебеларускім злёце конюхаў. Стары 85 гадовы ўдарнік Дарожкін Сяргей выпрацаваў за поўгада 214 працадзён, ён сваёй жвавасцю падганяе маладых, паказваючы ўзорныя прыклады і якасць у рабоце. Да канца года ён выпрацуе яшчэ столькі працадзён. Да 1 жніўня нашы ўдарнікі: Лысенка—выпрацаваў 222 працадня, Макееў—250, Малалетні Х.—227. Не адстаюць і жанчыны. Раманава П. выпрацавала да 1 жніўня—188 працадзён, Старчанка—155, Чарнышова—154. Ёсць многа яшчэ такіх ударнікаў і ўдарніц, якія за поўгода работы выпрацавалі ад 150 да 200 працадзён і тым самым забяспечылі сябе прадуктамі, каб жыць не думаючы аб тым, што не хопіць хлеба, бульбы. Узнікаюць іншыя патрэбы —развесці больш дробнай жывёлы бо прахарміць будзе чым.

ГЭТЫХ ПОСПЕХАЎ МЫ ДАМАГЛІСЯ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫЙНАЙ ЯЧЭЙКІ.

З гэтых-жа ўдарнікаў вылучаны і нашы брыгадзіры, яны карыстаюцца давер'ем калгаснай масы. Іх распараджэнні выконваюцца калгаснікамі таму, што ўсе працэсы работы добра ўлічваюцца, разнарадкі на работы выдаюцца загадзя. Да кожнай брыгады калгаса прымацаван член партыі. Наша партыйная ячэйка адыграла вялікую ролю ў ачыстцы калгаса ад кулакоў і шкоднікаў, дапамагла ў наладжванні працоўнай дысцыпліны і арганізацыі работы.

Мы сталі цвёрда на шлях да заможнага жыцця і на гэты шлях вывела нас выкананне ўказанняў нашага першага калгасніка дарагога т. СТАЛІНА.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам партячэйкі мы ўдзесяцярым нашу энергію, напрудзім усю нашу волю, яшчэ пільней будзем сачыць за ўсякімі вылазкамі класавых ворагаў, выкрываць іх з тым, каб завяршыць апошнія палявыя работы, уборку гародніны, добра захаваць ураджай, распачаць падрыхтоўку да будучага года, каб дабіцца яшчэ большых поспехаў у павышэнні ўраджайнасці, каб зрабіць наш калгас сапраўды большэвіцкім, а калгаснікаў—заможнымі.

Калгаснікі - ўдарнікі калгаса імя Чырвонай арміі: ШПАКАВА, ЦЯРЭШЧАНКА, СНАРАЎ, КАЗЛОЎ, ІВАНОЎ, ЛЫСЕНКА, КОЛАСАЎ К., РАЎКОЎ А., МАКЕЕЎ, РАЎКОЎ С., ХЛУСЕВІЧ, МІНІН, КУЛІКАЎ, ІЛЬІН, ГІЛЬМАН, ЦІТАЎ, КРЫЖЭВІЧ, ЕРМАЛАЕЎ, РАЎКОЎ Я., ДАРОЖКІН, НЕЙДЛІН, КЛЕМБАЛАЎ, ЭЛЬБЕРТ, АРЛОЎСКІ, ПАЎЛОЎСКІ.

...Першымі па сельсовету і датэрмінова выканалі свае абавязкі перад дзяржавай.

Калгаснік ГАВАРЦОЎ—лепшы вартаўнік калгаса імя Чарвякова, Віцебскага сельсовета.

ВОСЬ ЯНЫ—ПЕРАВАГІ КАЛГАСНАГА ЖЫЦЦЯ.

Чорнай хмарай, без кавалачка света, з года ў год ішло жыццё. «Ну, вось у гэтым годзе хлебушка лепш уродзіць —хоць адзін год пажывём без клопат і гора».

Дзеля гэтых нязбытачных мар дзень і ноч работалі як валы сяляне-беднякі, калупаліся ў зямлі сахой, драўлянай бараной, аддавалі ўсю сваю сілашку, а света ўсё роўна не бачылі. Панавала доўгая, жудасная ноч...

Вось што апавядае калгасніца ШУМАРАВА з калгаса „Праўда“, Замастоцкага сельсовета.

«Былі мы тады з мужыком маладыя, жыць хацелася добра, заможна. Было многа сілы, не шкадавалі яе, ледзь не рукамі варочалі зямлю. Было ўсяго зямлі ў нас 4 дзесяцінкі, і прыгоднай, і няўдобіцы, адна карова, адзін конь. Але вось у адзін год быў асаблівы недарод. Прышлося збыць карову. Дзеці малыя засталіся без малака. Пяць год прайшло раней, чым збіліся на карову. Часта сена не хапала, прыходзілася каня прадаваць, потым мала было гною, а таму і зямля радзіла дрэнна. З «Пакрава» ўжо не было хлеба. І ішлі да суседа, кулака-міраеда, клянчылі, malілі, называлі «карміліцам», прасілі пазычыць пудзік-другі на адработку, а тады ў гарачую, страдную пару ліліі пот і слёзы на кулацкай ніве ..

Праходзілі маладыя гады, падрасталі дзеці, павялічваліся запатрабаванні, як снежны ком расла запазычанасць па падатках. З кожным годам гасла надзея на лепшае жыццё...

***

У калгас уступілі ў 1931 годзе. З ахвотай і шчыра ўзяліся за работу. Не хацелася і слухаць рознную кулацкую хлусню пра калгасы. І ўжо ў першы год мы адчулі на сабе перавагі калгаснага жыцця. Цэлы год пражылі з хлебушкам, гэта падбадзёрыла нас, узняло настрой, а тут стала ўвоздзіцца здзельшчына, пазней увялі разлік з калгаснікамі па працаднях—гэта яшчэ больш зацікавіла нас у рабоце. Чатыры душы ў нас—трое стала выходзіць на работу. Ніводнага прагула мы не маем. Таму на сёнешні дзень мы можам пахваліцца добрымі вынікамі. Выпрацавана ў нас за паўгода 250 працадзён, ды яшчэ да канца года будзе амаль столькі. Падлічылі ў праўленні, што ўсякага збожжа—жыта, ячменя, аўса—у гэтым годзе атрымаюць калгаснікі каля 10 фунтаў, бульбы больш 13 фунтаў, сена 8 фунтаў на працадзень. Ну, і выходзіць, што на самай справе наша калгаснае жыццё з кожным годам наладжваецца, што ў гэтым годзе мы можам падумаць не толькі аб кароўцы і хлебе—гэтым мы забяспечаны поўнасцю—але зможам набыць і абутак, вопратку, і рознае гаспадарчае начынне. Толькі тры гады жывём у калгасе, а тое, аб чым мы марылі ў маладых гадах, ужо ажыццяўляецца.

Дрэнна жывецца ў калгасе толькі гультаям. Не любяць іх і ў нас, таму і выключылі мы з калгаса лодыраў Казлова і Ліўшыца. Большасць-жа калгаснікаў на работу выходзіць дужжа, бо яны—былыя батракі Ляхоўскага пана—добра разумеюць, што калгас іх вывеў на шырокую дарогу жыцця, што работаюць яны зараз не на пана, а на сябе, на ўзмацненне соцыялістычнай гаспадаркі. Вось чаму наш калгас ідзе ўперадзе па сельскагаспадарчых работах.

***

Па жыце, ячменю і бульбе калгас разлічыўся поўнасцю з дзяржавай. Авёс, накіраваны для здачы, не быў прынят з-за вільготнасці. Зараз ён прасушан, і 27,6 цэнтн. здана дзяржаве. Ільнанасенне здана калгасам поўнасцю—10,75 цэнтн.

План азімай сяўбы калгас выканаў 8 верасня. Засеяна 45,80 га жыта і 20 га пшаніцы, на 10 га больш за мінулы год, на зябліва паднята 24 га, засіласавана 25 тон звыш плана.

***

Поспех у выкананні збожжа і бульба паставак, ва ўборцы і азімай сяўбе калгас «Праўда» дасягнуў дзякуючы правільнай арганізацыі работы, дзякуючы наладжанай працоўнай дысцыпліны. Калгаснікі кажуць: „Нас не трэба выганяць на работу, мы самі шукаем яе“. Асноўная маса калгаснікаў за раннія тэрміны сяўбы, за нормы і план, якія высоўвае партыя і ўрад, па ўсіх відах сельска-гаспадарчых работ. Таму і не ведае калгас прарываў.

Такіх былых беднякоў, як сем'я ШУМАРАВА КІРЫЛА, у калгасе многа. Вось ВАРТУЛЁЎ ПАРФЕН (сем'я 8 чалавек) гаворыць:—„Куды-б я цяпер дзеўся на сваёй зямлі з такой аравай, у калгасе-ж для кожнага ёсць работа, кожны зарабатвае працадні. Сапраўды пяць чалавек з сям'і Вартулёва работаюць ў калгасе, не маюць прагулаў без уважлівых прычын. „Ну і жывём—аб заўтрашнім дні не тужым“—гаворыць Парфен.—Работаем, змагаемся, каб лепей было і на далей“. Парфена брат, 63 гадовы стары — ВАРТУЛЁЎ СЦЕПАН, каваль, улетку пераключаецца заўсёды на палявыя работы - і ў два разы перавыконвае нормы.

Сын ШЛЫКАВА Рамана нават скардзіцца на свайго бацьку за тое, што не можа за ім угнацца па рабоце. Стары бацька заўсёды дае больш высокія нормы выпрацоўкі, чымся ён, малады і дужы хлапец.

ПАЎЛАЎ АЛЕКСАНДР, СІМЕНКОЎ ДЗМІТРЫЙ і інш., заўсёды перавыконваючы норму выпрацоўкі, вядуць за сабой астатнія масы калгаснікаў на барацьбу за ўмацаванне калгаса. Калгас на працягу ўсяго часа свайго існавання зусім не ведае страт ураджая па тых альбо іншых прычынах. Ніводзін кілограм бульбы не згніў. Бульбу на насенне загоўвае брыгадзір брыгады № 1 ЛЯХОЎСКІ ФЕДАР, брыгада яго ідзе першай па калгасе па ўсіх відах работы. Былыя батракі: ЧАРНЕЦКІ ВАСІЛЬ, ЯЦКЕВІЧ МІХАІЛ і інш. так сама паказваюць узоры інтэнсіўнай работы і дысцыплінаванасці—усёй сям'ёй выходзяць на работу.

Вось гэтая арганізацыя работы, гэтая адданасць калгасу былых беднякоў і серадняков, былых батракоў і вырашаюць поспех у яго арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні.

Паступова, але няўхільна ператвараецца ў жыццё лозунг геніяльнага правадыра т. СТАЛІНА. Калгас «Праўда» робіцца сапраўды БОЛЬШЭВІЦКІМ, а калгаснікі гэтага калгаса становяцца ЗАМОЖНЫМІ.

СІПКО.

Партыйная ячэйка згуртавала вакол сябе моцны актыў.

Будучы абраным сакратаром партячэйкі ў калгасе «Чырвоная армія», Елагінскага сельсовета, я адразу ўзяўся за стварэнне моцнага партыйнага актыва. Усе партыйцы былі прымацаваны да брыгад. Разгарнулі спаборніцтва паміж брыгадамі і асобнымі калгаснікамі.

У калгасе мелі месца сістэматычныя невыхады на працу, наглядалася расхлябанасць у працы, не было працдысцыпліны.

На брыгадных сходах, у часе абедзеных перапынкаў, побач з распрацоўкай пастаноў партыі і ўрада, сканцэнтроўвалася ўвага і накіроўваўся агонь супроць парушыцеляў працдысцыпліны. Якаўлеву Лізавету, Рыбакова Міхаіла і інш. прагульшчыкаў брыгадныя сходы патрабавалі ад праўлення выключыць з калгаса. Побач з гэтымі мерамі была разгорнута масава - растлумачальная работа, да якой прыцягнулі актыў калгаснікаў, лепшых ударнікаў, як: т. Юзэпенка Карп, Падмазаў, Лысенка, Раўкоў Міхаіл і інш. З дапамогай іх праз насценгазету быў выкрыт і выкінут з калгаса шкоднік, былы падпалкоўнік Казлоў Алексей, які будучы брыгадзірам скотнага двара—драпежніцкі адносіўся да жывёлы. 46 дойных кароў давалі не больш як 95 — 100 літраў малака ў дзень улетку. Зараз, дзякуючы таму, што брыгадзірам пастаўлен лепшы ўдарнік Мінін, гэтыя каровы даюць 165 літраў малака ў дзень. Патрэбна адзначыць ударную працу кладаўшчыка т. Нэйліна. Ён сапраўды здолеў вопыт ударнай працы на фабрыцы перанесці ў калгас, наладзіўшы ўчот і парадак у кладавой.

Дзякуючы добрасумленным адносінам да працы старшыні калгаса, члена партыі т. Паўлоўскага, нам. старшыні — дэлегата 1 усесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў т. Раўкова Якуба і мабілізацыі шырокіх мас калгаснікаў—мы зараз дасягнулі таго, што наш калгас сапраўды ператвараецца ў большэвіцкі, а калгаснікі становяцца заможнымі.

Мы зараз маем 4 дзіцячых пляцоўкі і ясляў, што забяспечвае своечасовы выхад на работу жанчын-калгасніц. Але разам з тым, маем яшчэ многа недахопаў. Назіраюцца выпадкі невыхада на работу некаторых жанчын, якія на агульным сходзе абавязаліся падцягнуцца.

Сакратар партыйнай ячэйкі ЭЛЬБЕРТ.



Дзеці калгаснікаў у дзіцячым садзе (калгас імя Чарвякова, Віцебскага сельсовета).

НЕ СУПАКОЙВАЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ.

Елагінскі сельсовет скончыў веснавую сяўбу амаль першым па раёне і ўзяў на буксір калгас „НОВЫ ШЛЯХ“, Бабініцкага сельсовета вылучыўшы туды буксірную брыгаду на чале з старшынёй сельсовета т. ПАЎЛЮЧЭНКА. Уборку азімых сельсовет скончыў 10 жніўня, асеннюю сяўбу 20 верасня праўда са спазненнем. Сельсовету аказаў значную дапамогу шэф—фабрыка „Сцяг індустрыялізацыі“. Ім была праведзена палітычна-масавая работа, накіравана некалькі брыгад для практычнай дапамогі ў хутчэйшым завяршэнні работ.

Калгасы імя Гамарніка і «2 большэвіцкая вясна» дзякуючы адноўленаму кіраўніцтву, дабіліся карэннага пералома ў сваёй рабоце. Зараз яны скончылі ўсе сельска-гаспадарчыя работы і вылучылі буксірную брыгаду ў адстаючы калгас «Капачова».

Рад брыгадзіраў ГК КП(б)Б і гарсовета, з'яўляючыся ўпаўнаважанымі дзесяцідвораў, па-большэвіцку ўзяліся за работу і дабіліся вялікіх поспехаў, як напрыклад, т. ЭПШТЭЙН (калгас «2 большэвіцкая вясна») і т. ВОЛЬБЛЮМ («Гамарнік»).

25 верасня па ініцыятыве фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» праведзена канферэнцыя калгаснікаў-ударнікаў і працоўных аднаасобнікаў, дзе былі пастаўлены пытанні паляпшэння працы і метадаў шэфства. Канферэнцыя яшчэ больш узняла актыўнасць мас калгаснікаў і аднаасобнікаў па выкананні ў тэрмін усіх заданняў партыі і ўрада. Калгас «Капачова», які ўвесь час цягнуўся ў хвасце, зараз значна падцягнуўся.

Але неабходна адзначыць, што сельсовет недастаткова скарыстоўвае актыў, у прыватнасці настаўніцтва сельсовета для праводзення масава палітычнай работы.

Дасягнутыя поспехі ў выкананні асобных відаў сельска-гаспадарчых работ ні ў якім разе не павінны заспакоіць нас, а павінны яшчэ больш узняць актыўнасць мас на хутчэйшае выкананне ўсіх відаў паставак дзяржаве.

АБЕЛЕЎ.

Мая праца не прапала дарэмна.

Яшчэ і зараз перад маімі вачыма трыбуна Усесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў і на ёй наш дарагі, самы старэйшы калгаснік-ударнік—тав. СТАЛІН. Ён гаворыць нам аб мінулым аднаасобным жыцці, раўнае яго з калгасным жыццём, гаворыць аб нашых сучасных задачах. Памятаю, як адразу мне ўсё стала ясна пасля яго прамовы, як я зразумеў, што з мінулым, цёмным аднаасобным жыццём, да якога нас яшчэ зараз цягнуць кулацка варожыя элементы трэба парваць назаўсёды.

Я зразумеў,—што ад нас патрабуецца рэвалюцыйная класавая пільнасць, упартая напружаная работа, каб хутчэй стаць заможнымі, каб вывесці калгас на шырокі тлях соцыялістычнага будаўніцтва.

Звярнуўшыся ў калгас я адразу ж на агульных сходах падзяліўся сваімі ўражаннямі, простымі словамі, як умеў, растлумачваў тыя задачы, якія перад намі паставіла партыя на гэтым вялікім з'ездзе. І мая праца не прапала дарэмна. Зараз-жа быў зняты з пасады конюха і выключан з калгаса былы ўраднік ДАРОЖКІН РЫГОР, які драпежніцкі адносіўся да каня. За дрэнныя адносіны да каня быў выключан з калгаса МАСТЫКА НІКАЛАЙ. Гэтыя меры зрабілі ўплыў на астатніх калгаснікаў, якія пачалі лепш адносіцца да выканання сваіх абавязкаў.

Актыўна мы прыступілі да выкрывання кулацка-варожага элемента. Мы вычысцілі 14 гаспадарак, у лік якіх уваходзілі: ПАТОЦКІЯ, КРЫЖЭВІЧЫ, КНІЖНІКАВЫ і інш.—былыя ўраднікі, кулакі, пазбаўленыя права голаса.

Па-ўдарнаму пачалі працаваць—ад цёмнага да цёмнага, а калі трэба было і круглыя суткі.

Людзі перарабіліся з мёртвых у жывыя, заахвочвалі адзін аднаго да работы, патрабавалі выключэння злосных прагульшчыкаў. І наша праца дала нам добрыя вынікі. Па папярэднім падлікам наш працадзень будзе каштаваць многа. На справе апраўдваюцца словы тав. СТАЛІНА. Пачынаецца заможнае жыццё.

РАЎКОЎ ЯКУБ.

(Дэлегат 1 Усесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў).

Буду работаць яшчэ больш ударна.

Зразумеўшы, што для выканання лозунга правадыра нашай партыі т. Сталіна аб заможным жыцці патрэбна ўдарная работа, рашучая барацьба са зрыўшчыкамі працоўнай дысцыпліны, я заключыў соцдагавор з калгаснікам Цярэшчанка Ягорам і дамагаюся яго выканаць. Прымаю актыўны ўдзел у працы насценгазеты, выкрываючы тых калгаснікаў, якія лічаць сваю ўласную справу вышэй за калгасную.

Зараз, калі наш калгас „Чырвоная армія“ сапраўды стаў на шлях выканання лозунга правадыра нашай партыі, я дэлегат 2 ўсебеларускага з'езда калгаснікаў-ударнікаў, даю абяцанне яшчэ больш актыўна працаваць у калгасе і перадаваць вопыт сваёй работы другім калгасам, актыўна дапамагаючы ім выйсці з прарыва разам з буксірнай брыгадай, у якую мяне вызначылі для дапамогі адстаючаму калгасу „Капачова“.

ЮЗЭПЕНКА КАРП.

(Дэлегат 2 усебеларускага з'езда калгаснікаў-ударнікаў).

За чытаннем газет у часе перапынка на малацьбе (калгас імя Чарвякова, Віцебскага сельсовета).

КРУТА УЗНЯЦЬ ТЭМПЫ ЗЯБЛІВАГА ВОРЫВА!

Бязлітасны адпор апартуністычнай „чарговасці кампаній", перакінуць на зяблівае ворыва не менш 50 проц. цягавай сілы, да 25 кастрычніка поўнасцю і высокаякасна выканаць план!

Зябліваму ворыву—большэвіцкія тэмпы і якасць.

Трывогу за лёс ураджая будучага года, за паспяховае правядзенне веснавой сяўбы другога года другой пяцігодкі выклікаюць лічбы аб ходзе зяблівага ворыва па раёне.

На 10 кастрычніка зазаблена па ўсіх сектарах раёна толькі 12,7 проц., або 2405 га з планавых 18-00 га. Гэта ў той час, калі яшчэ на 5 кастрычніка па ўсёй БССР было зазаблена 19,8 проц., па Ярцаўскім раёне Заходняй вобласці, з якім мы спаборнічаем, 22,5 проц. З гэтых лічбаў бачна, як недапушчальна ганебна мы адстаем ад усіх раёнаў БССР і Заходняй вобласці, якімі чарапашшымі тэмпамі ідзе зябліваe ворыва ў нашым раёне.

Прыходзіцца яшчэ і яшчэ раз напамінаць аб рашэннях ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б па зяблівым ворыве: „ДРЭННАЯ РАБОТА ПА ЗЯБЛІВЫМ ВОРЫВЕ Ў МІНУЛЫМ ГОДЗЕ МЕЛА ВЫКЛЮЧНА ДРЭННЫ УПЛЫЎ НА ПАСПЯХОВЫ ХОД ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ І Ў НЕКАТОРЫХ РАЁНАХ ПРЫВЯЛА ДА НЕВЫКАНАННЯ ПЛАНА СЯЎБЫ". ЦК КП(б)Б устанавіў апошнім тэрмінам ворыва зябліва 25 кастрычніка. Калі наш раён і ў далейшым будзе працягваць такімі „тэмпамі" зябліваe ворыва, то ў наяўнасці нагроза зрыва зябліва з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі.

У чым прычыны такога глыбокага прарыва нашага раёна ў зябліве?

Яны крыюцца ў неўменні па большэвіцку спалучыць правядзенне сельска-гаспадарчых работ, у наяўнасці апартуністычнай стаўкі на чарговасць кампаній. Вось характэрны прыклад. У калгасе „Прафінтэрн", Рудакоўскага сельсовета, яшчэ не ўзнята ніводнага га зябліва. Старшыня калгаса РОНІН лічыць справу ўздыма зябліва другараднай справай, зусім забываючы аб тым, што калгас у час веснавой сяўбы гэтага года з-за таго, што ў мінулую восень не было ўзнята ніводнага га зябліва самым ганебным чынам адставаў у сяўбе. Старшыня калгаса імя ВАРАШЫЛАВА Міхалёўскага сельсовета, Гузаў апартуністычна ігнаруе зябліваe ворыва, заяўляючы: «Раней убярэм бульбу а потым возьмемся за зябліва, часу яшчэ хопіць». Такія апартуністычныя, шкодныя настроі, якія маюць месца яшчэ ў радзе калгасаў і сельсоветаў, зрываюць выкананне плана зяблівага ворыва.

Руйнуючы ўдар па апартуністычнаму самацёку і чарговасці кампаній. Трэба неадкладна, не губляючы ні воднай мінуты і гадзіны, узяцца за касаўшы рукавы, за выкананне дырэктывы ЦК КП(б)Б аб зяблівым ворыве, перакінуць не менш 50 проц. усяго цягла на ворыва

Фарсуючы зябліваe ворыва,—максімум увагі—якасці ворыва. Якасць ворыва павінна быць у цэнтры ўвагі ўсіх сельсоветаў, усіх калгасаў. Сюды—на гэты ўчастак трэба накіраваць увагу камісій па якасці, якія ў радзе калгасаў (імя Сталіна. Машканскага сельсовета, імя Молатава, Шумянскага сельсовета) паказалі вельмі дрэнныя прыклады барацьбы за высокую якасць і азімай сяўбы. Ніводнага га зябліва не можа быць прынята без заключэння камісіі па якасці—вось чаго трэба прытрымлівацца, каб сапраўды забяспечыць высокую якасць зяблівага ворыва

Не ігнараваць працоўнага аднаасобніка! Дагэтуль аднаасобны сектар пры агульным адставанні ўзнімае зябліва горш чым саўгасы і калгасы. Толькі 5,6 проц. зябліва ўзнялі аднаасобнікі на 10 кастрычніка.

Наш раён мае усе магчымасці ва ўстаноўлены тэрмін—да 25 кастрычніка цалкам выканаць план зябліва. Патрэбна толькі баявая ўвага да гэтай важнейшай задачы, патрэбна гнуткае аперацыйнае кіраўніцтва каб завяршаючы збожжапастаўкі, капанне і пастаўку бульбы, ільнаапрацоўку і здачу ільнопрадукцыі дзяржаве па кантрактацыйных дагаворах, сіласаванне, аднаčасова, у тэрмін і высокаякасна выканаць план зяблівага ворыва.

Ні на адну мінуту нельга забываць, што лёс ураджайнасці будучага года, далейшае ўзняццё калгаснай заможнасці, вагі працадня калгасніка ў многім залежыць ад тэмпаў і якасці зяблівага ворыва. Зябліваму ворыву—БАЯВАЯ БОЛЬШЭВІЦКАЯ ЎВАГА, ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ І ЯКАСЦЬ.

УЗНЯТА ЗЯБЛІВА.

(У процантах да плана).

На 1 кастрычніка	На 5 кастрычніка	На 10 кастрычніка
8	9,9	12,7

ХОД ЗЯБЛІВАГА ВОРЫВА НА 10 КАСТРЫЧНІКА 1933 г.

(У процантах да плана).

ПА СЕЛЬСОВЕТАХ.

(Калгасна сялянскі сектар)

Елагінскі	26,7
Міхалёўскі	25,6
Вяліка-летчанскі	18,5
Бараўлянскі	16
Бабініцкі	13,5
Шумянскі	13,4
Віцебскі	12,2
Сялюцкі	11,1
Замастоцкі	10,0
Машканскі	9,7
Мікалаёўскі	9,3
Рудніцкі	8,3
Старасельскі	7,1
Даўжанскі	5,3
Рудакоўскі	2,4

У тым ліку:

Калгасы	12,3
Аднаасобнікі	5,6
Совгасы	8,7
Ка п асы	16,9
Іншыя	30,7
Разам па раёне	12,7

Узмацніць тэмпы зяблівага ворыва.

Не гледзячы на тое, што цяглавая сіла поўнасцю не скарыстоўваецца, у калгасе імя Варашылава, Міхалёўскага сельсовета, з 110 га зяблівага ворыва па плане, да апошняга часу было ўзарана толькі 29. Старшыня калгаса Гузаў дэмабілізуе калгасныя масы, заяўляючы: „З ворывам яшчэ паспеем". Ні ў якім выпадзе, калі калгасні ві бяруць калгасных коней для працы на сваіх гародах і па цэлай пяцідзёнцы не выходзяць на працу.

Наогул у калгасе пануе абязлічка ва ўтрыманні коней, збруі і інвентара. Коні маюць дрэнны выгляд. Няма сталага конюха, дзякуючы чаму коні гэтымі днямі стапталі каля 3-х га насеннай канюшыны.

Адставанне калгаса імя Варашылава ў зяблівым ворыве недапушчальна. Рашуча пакончыўшы з кулацкімі развагаммі Гузава, неабходна ўзмацніць тэмпы зяблівага ворыва.

МАШЭРА, ПАЎЛЕНКА

Не адчуваюць адказнасці за зябліва.

У калгасе «ЗОРКА», Бараўлянскага сельсовета, да зяблівага ворыва яшчэ дагэтуль не прыступілі. Старшыня калгаса БАГДАНАЎ разважае: «Скончым уборку, коні пакуль заняты». У той жа час штодзённа не скарыстоўваецца ў калгасе па некалькі коней.

7 кастрычніка для зяблівага ворыва быў накіраван з калгаса «Асінаўка» трактар. Трактарысты Марозаў і Багатыроў да часу дня не выехалі на поле, праспалі, а калі яны ўжо выехалі, загадчык вытворчага ўчастка МТС Канчэўскі чамусці трактар назад накіраваў у „Асінаўку".

Калгаснік ЛЕБЕДЗЕЎ.

Поўным выкарыстаннем жывой і механічнай цягавай сілы забяспечым заканчэнне зяблівага ворыва ў тэрмін!

Па прыкладзе вёскі Луцікі разгарнуць зябліваe ворыва.

Аднаасобнікі вёскі ЛУЦІКІ, Рудакоўскага сельсовета, разгарнулі зябліваe ворыва. Якасць ворыва добрая, без агрэхаў і глыбінёй 13—15 см.

Працоўныя аднаасобнікі в. Луцікі абавязуюцца своечасова скончыць ворыва і выклікаюць паследваць іх прыкладу астатнія вёскі сельсовета. ПЯЧКУРАЎ.

ПАЛЕПШЫЦЬ РАБОТУ ТРАКТАРНАГА ПАРКА.

З 18 верасня ў калгасе «Асінаўка», Бараўлянскага сельсовета, работае трактар «Інтэр» (трактарысты ШЫЛАЎ і МАРОЗАЎ). Да гэтага часу паднята толькі 60 га зябліва з планавых 270. Дзе прычыны такіх ганебных тэмпаў?

Нормы трактарыстамі не выконваюцца. Замест 7 га, ўзнімаюць 2—2,5 га у дзень Трактарысты работаюць толькі ў адну змену (няма ліхтароў). Выязджаюць на працу ў 8—9 гадзін, з вялікімі спазненнямі. Трактарыст Шылаў дрэнна адносіцца да працы, неахайна адносіцца да машыны, дапускаючы частыя паломкі яе.

Другі трактар «Інтэр» работае ў калгасе імя ЛЕНІНА. Па плану трэба падняць пад зябліва 320 га, а паднята за месяц толькі 15. Механік калоны ЧЫСТАБАЕЎ не сочыць за работай трактара, злачынна бяздзейнічае. Ён не арганізоўвае начной работы, спасылаючыся на адсутнасць ліхтароў. Трактарысты Новікаў, Піхноў, Крыцкі позна выязджаюць на працу, пакідаюць трактары без варты пад адкрытым небам.

Дрэнна вядзецца ўлік работы трактарыстаў. Загадчык вытворчага ўчастка МТС КАНЧЭЎСКІ залічвае усім трактарыстам аднолькавую колькасць прапрацаванага, незалежна ад выпрацоўкі.

Побач з гэтым неабходна адзначыць, што з боку праўлення калгаса імя Леніна не створаны ўмовы для работы трактарыстаў.

Трэці трактар «Фардзон» работае ў буйнейшым калгасе „ПРЫЗЫЎ". Нормы тут таксама не выконваюцца.

На ўсе гэтыя агідпасці загадчык вытворчага ўчастка МТС Канчэўскі не рэагуе. Ён рэдка бывае ў калгасах, а калі і бывае, дык толькі ў канцылярыі праўленняў. Аграгома Філіпенка таксама ніколі не бачна на полі

Акрамя таго, што не выконваюцца нормы, маецца вялікі перавыдатак гаручага. За жнівень было перавыдаткавана 49 кіло, за верасень таксама, але вінаватых, па заяве механіка Чыстабаева, «знайсці немагчыма».

Дырэкцыя МТС павінна неадкладна прыняць меры да палапшэння работы трактарнага парка, каб забяспечыць своечасовае правядзенне малацьбы і зяблівага ворыва.

АЗАРОНАК.

Фашысцкія „сведкі" заблыталіся.

ПРАГА, 10 На працэсе аб падпале рэйхстага заслухоўваецца паказанне новага „сведкі" ТАЛЕРА, у задачу якога ўваходзіць падмацаваць апошнюю афіцыйную версію, што Ван дэр-Любе ўлязаў у вакно рэйхстага і тым самым зняць пытанне аб скарыстанні падпальшчыкамі падземнага хода з кватэры Герынга. Талер паказвае, што ён нібыта бачыў, як у вакно будынка рэйхстага ўлязалі двое і як у памяшканні рэстарана рэйхстага нехта бегаў з факелам у руках. Талер заявіў, што патушыўшы пажар у рэстаране пажарныя ўехалі. Аднак, праз некаторы час, убачыўшы агонь у купале рэйхстага, сведка звярнуўся назад і паведаміў пажарным, што будынак гарыць таксама і знутры

Пасля гэтага надта загадачнага паказання падазрона таксама паказанне сведкі паліцэйскага БУВЕРТА. Ён першым прыбег да рэйхстага, аднак, не пазнаў „сведку" Талера, які нібыта паведаміў яму аб пажары.

Па словах агенцтва „Вольф", Дзімітраў „зноў пачаў задаваць недапушчальныя пытанні". Старшыня суда груба абрывае Дзімітрава.

Апошні адказвае: «На гэтым працэсе я не даўжнік, а крэдытор, а пагэтаму»...

СТАРШЫНЯ: „Пазбаўляю вас слова".

ДЗІМІТРАЎ рашуча пратэстуе.

Потым старшыня запытваецца ў Ван дэр-Любе: „Вы адны ўлезлі ў будынак рэйхстага"?

Адказ: „Так".

СТАРШЫНЯ: «Вы адны падпалілі рэйхстаг»?

ВАН ДЕР-ЛЮБЕ: «Так».

Дзімітраў голасна заяўляе: „Гэта немагчыма, гэта зусім выключана".

ПРАКУРОР запытвае Ван дэр-Любе: «Ці не падрыхтаван пажар другімі»?

Ван дэр Любе адказвае: „Я гэта не магу сказаць".

Дзімітраў кідае рэпліку: «Ван дэр-Любе не хоча прызнаць, што ён быў зброяй другіх».

Пасля гэтага пасяджэння абвяшчаецца перапынак на адзін дзень.

ПРАГА, 11. Берлінскі карэспандэнт „Прагер тагеблат" адзначае дзіўныя паводзіны і супярэчнасці ў паказаннях «сведак» Флетэра і Талера, заявіўшых, што яны праходзілі міма будынка рэйхстага. Першы з іх бачыў аднаго чалавека ўнутры будынка з факелам, а другі далёка. Газеты паведамляюць, што балгарскія адвакаты Грыгораў і Дэечаў, якім афіцыйна дазволілі прысутнічаць на судзе і рабіць прапановы, патрабавалі ад афіцыйнага абаронцы балгарскіх падсудных Тэйхерта, каб ён прадпрыняў крокі да атрымання дакументаў і выкліку некалькіх сведак, паказанні якіх могуць служыць інтарэсам абвінавачаных. Тэйхерт груба адмовіўся размаўляць на гэту тэму і крычаў, называючы прапанову балгарскіх адвакатаў „бессорамным умяшальцельствам у ход працэса».

ВЫКЛЮЧЭННЕ тав. ДЗІМІТРАВА З ПАСЯДЖЭННЯ СУДА.

ПРАГА, 11. Рэйхстаг ацэплен яшчэ больш узмоцненым паліцэйскім кардонам. І наведвальнікі падвяргаюцца яшчэ больш строгаму кантролю чым раней. Старшыня абвяшчае, што ў будынку рэйхстага будзе зроблена інспэкцыя падзей, адбыўшыхся ў час падпала.

У сувязі з гэтым Дзімітраў хоча задаць пытанне, але старшыня без усякай падставы пазбаўляе яго слова. Дзімітраў рашуча пратэстуе і заяўляе: «Мы не толькі падсудныя, мы абаронцы». Суд удаляецца на нараду і праз кароткі час старшыня абвяшчае: „За паўторнае непадпарадкаванне распараджэнням старшыні, Дзімітраў выключаецца з пасяджэння суда. Адвядзіце яго ў турму". Дзімітраў рашуча і ўсхвалявана пратэстуе, але яго гвалтоўна выводзяць з залы. Газеты маркуюць, што старшыня неспраста справакаваў выключэнне Дзімітрава з суда.

„Ганебны правал абвінавачвання".

ЗАМЕЖНЫ ДРУК АБ ВЫНІКАХ ПРАЦЭСА.

ПРАГА, 10. „Часко слово" падводзіць вынікі працэса аб падпале рэйхстага. Газета лічыць устаноўленым: 1. Усе прысутныя ў залі, а таксама ўвесь свет цвёрда пераканаы ў невіноўнасці Торглера і балгарскіх комуністаў. 2. Падсудныя комуністы цалкам даказалі свае алібі. 3. Ван дэр-Любе зусім яскрава заявіў, што падсудныя комуністы не маюць ніякіх адносін да падпала. 4. Няма ніводнага сведкі, які змог-бы даказаць удзел Торглера і балгарскіх комуністаў у падпале рэйхстага. Газета расцэньвае мінуўшыя тры тыдні працэса як ганебны правал абвінавачвання. Але па думцы газеты, памылкова лічыць, што падсудныя комуністы выратаваны. Ім паграджае вялікая небяспека.

ПАРЫЖ, 11. Французскі друк як і раней недаверліва расцэньвае прыводзімыя на лейпцыгскім працэсе „доказы" абвінавачвання. Газеты ўказваюць на супярэчнасці ў паказаннях «сведак» Флетэра, Талера і Буверта. „Пары суар" піша, што „галоўныя сведкі таксама не прынеслі вялікай карысці абвінавачванню".

Германскія планы наконт Швейцарыі.

ВЕНА, 11. У швейцарскіх кіруючых колах выклікалі вялікі непакой выкрыцці ангельскага публіцыста Сціда і лонданскага карэспандэнта «Ілюстраваны кур'ер" додзенны» Аўгура аб стратэгічным плане германскага генштаба. Паводле гэтых выкрыццяў прадугледжваецца парушэнне германскай арміяй нейтралітэта Швейцарыі накшталт парушэння нейтралітэта Бельгіі ў часе сусветнай імперыялістычнай вайны.

Не гледзячы на абвяржэнне з боку Германіі выкрыццяў Аўгура і Сціда, галава швейцарскага ваеннага ведамства Мінгер заявіў: «Швейцарскі народ будзе рашуча абараняць межы і нейтралітэт сваёй краіны».

ЯПОНСКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ ДАКАЗАНА.

Сусветны друк аб японскіх планах захопа КУЧ.

МАСКВА, 11. Сусветны друк адгукаецца на апублікаваныя совецкім друкам афіцыйныя японскія дакументы аб плане захопа КУЧ.

Ангельская ліберальная „Манчэсцер гардзіян" у перадавым піша, што Японія можа адмаўляць сапраўднасць гэтых дакументаў, адпак, яны вельмі адпавядаюць таму, што адбылася на Далёкім Усходзе.

Адносіны шведскіх газет да гэтых дакументаў характарызуюцца наступнымі загалоўкамі: „Японская правакацыя даказана", „Сістэматычны план рабавання КУЧ", „СССР выкрывае японцаў".

Румынскі мінзамспраў у Варшаве.

Тытулеску ўручыў т. Антонаву-Аўсеенка грамату аб ратыфікацыі Румыніяй лонданскай канвенцыі.

ВАРШАВА, 11. Сюды прыбыў румынскі міністр замежных спраў Тытулеску.

Тытулеску і румынскі пасол ў Варшаве Кадэрэ наведалі паўпрэда СССР т. Антонава-Аўсеенка і ўручылі грамату аб ратыфікацыі Румыніяй лонданскай канвенцыі аб азначэнні агрэсара для перадачы гэтага дакумента совецкаму ўраду.

На прыёме прадстаўнікоў друку Тытулеску заявіў, што саюз Румыніі і Польшчы мае мэтай захаваць мір ва Усходняй Эўропе. «Адначасова мая паездка ў Варшаву,—заявіў ён,—скарыстана мною для перадачы паўпрэду СССР граматы, ратыфікуючай канвенцыю аб азначэнні агрэсара. Румынія імкнецца зрабіць усё магчымае, каб яе адносіны з СССР набылі сапраўды сардэчны характар Гутаркі, якія я меў, пераканалі мяне, што гэта жаданне з'яўляецца ўзаемным».

Перад ад'ездам Тытулеску ў гутарцы з прадстаўніком агенцтва Гавас заявіў, што «Совецка-румынскія адносіны з'яўляюцца надта добрыя». 10 кастрычніка Тытулеску выехаў з Варшавы ў Вену.

СЯЛЯНСКІЯ ХВАЛЯВАННІ Ў ПОЛЬШЧЫ.

ВАРШАВА, 10. У ліпені мінулага года, а таксама ў маі і чэрвені гэтага года ў горадзе Градзіску і некалькі вёсках Ропчыцкага і Жэшоўскага паветаў адбыліся масавыя сутычкі сялян з паліцэйскімі атрадамі. Барацьба ўзнікла на глебе парубкі леса і спагнання нядаімак. Па словах абвінаваўчага акта, у Градзіску 24 тысячы сялян асадзілі паліцэйскі ўчастак і абстрэльвалі паліцыю, якая адказвала залпамі. Ва ўсіх сутычках, па даных абвінаваўчага акта, было забіта 15 сялян і 2 паліцэйскіх і паранена некалькі дзесяткаў сялян і паліцэйскіх.

У Кракаве, Тарнове і Жэшове пачаўся суд над сялянамі, удзельнікамі гэтых выступленняў. Усяго на лаве падсудных 331 селянін.

КІТАЙ У РУКАХ ВАЕННЫХ САТРАПАЎ І ПАЛІТЫКАНАЎ.

ШАНХАЙ, 11. 10 кастрычніка споўнілася гадавіна стварэння кітайскай рэспублікі. Святкаванне адрозніваецца толькі скліканнем афіцыйных мітынгаў з удзелам членаў гаміндана і ўрадавых чыноўнікаў. Вулічныя дэманстрацыі і мітынгі забаронены. Зроблена некалькі арыштаў, каб «папярэдзіць дэманстрацыі комуністаў».

Кітайскі друк у сувязі з гадавінай надзвычай песімістычна расцэньвае становішча ў краіне. Бэйпінская газета «ЧЭНБАО» піша, што Кітай страціў чатыры паўночна-усходнія правінцыі, прычым Паўночны Кітай пакінуты «на літасць» Японіі. „Паўсюды расце згаленне і пакутванне». Газета „ШЫЦЗЕ ЖЫБАО" піша, „што пасля двух год са дня стварэння кітайскай рэспублікі Кітай застаецца аб'ектам захопніцкай палітыкі імперыялістаў. Палітычная ўлада ў краіне фактычна сканцэнтравана ў руках некалькіх ваенных сатрапаў і палітыканаў".

Прасоўванне японскіх стаўленікаў у Паўночным Кітаі.

ШАНХАЙ, 11. Паводле паведамлення з БЕЙПІНА, пасля невялікай перадышкі для перагавораў аб жаданні нібыта перайсці на бок Нанкіна войскі ФАН ЧЖЭН-у зноў аднавілі наступ у раёне на поўдзень ад ТАНШАНЯ (на поўнач ад Бейпіна), але вымушаны былі адступіць. У раёне НЮАНЬ новыя атрады, прыбыўшыя з Манчжурыі, гатовяць наступ на ЧАНЛІ (на Цанцзінь-Шанхайгуаньскай чыгунцы).

Рэволюцыйныя выступленні ў ангельскім флоце.

ЛОНДАН, 11. „ДЭЙЛІ МЕЙЛЬ" паведамляе аб чутках, што на буйным лінейным караблі „ХУД" перад адплыццём на манеўры мела месца «парушэнне дысцыпліны». Газета публікуе гэта паведамленне разам з абвяржэннем ваеннага міністра.

Заданне ЦК КП(б)Б у тэрмін не выканана.

Да 15 кастрычніка ва што-б та ні стала завяршыць уборку і ВЫТВАРЫЦЬ ПЕРАВОРВАННЕ ўсёй бульбы.

ХОД УБОРКІ БУЛЬБЫ І БУЛЬБАПАСТАВАК па калгасна-сялянскім сектары на 10 кастрычніка 1933 г.

(У процантах да плана).

СЕЛЬСОВЕТ.	Выкапана.	Пастаўлена.
Старасельскі	87,3	52,5
Вяліка-летчанскі	77,8	51,3
Елагінскі	77,5	98,2
Віцебскі	72,4	38,2
Бабініцкі	70,6	47,9
Міхалёўскі	70,4	61,9
Замастоцкі	68,4	66,0
Бараўлянскі	63,6	68,4
Шумянскі	57,5	61,9
Сялюцкі	51,8	39,7
Машканскі	49,5	40,0
Рудакоўскі	48,4	12,1
Рудніцкі	44,8	24,8
Даўжанскі	33,8	49,3
РАЗАМ	—	49,5
Калгасы	71,0	
Аднаасобнікі	49,5	
Совгасы	48,0	
Каапгасы	46,0	
Іншыя	81,2	
	64,0	

УВАГА: Зніжэнне процантаў па капанню бульбы па некаторых сельсоветах у параўнанні з данымі на 5 кастрычніка тлумачыцца тым, што у план па аднаасобным сектары ў гэтай зводцы ўключан засеў бульбы на гародах калгаснікаў.

Ход бульбапаставак на 13 кастрычніка.

(У тонах)

План	Паступіла	Проц. вык	Прырост за 11 і 12 кастрычн.
9372	4967	52,9	225,5

Труханаў сабатуе бульбапастаўкі.

На 9 кастрычніка па калгасу «Іскра», Віцебскага сельсовета, засталося яшчэ выкапаць 20 га бульбы. Якасць першай копкі надзвычай дрэнная Так, на першым полі не прама па баразне ўзорвалі, а часта з яе збіваліся і па словах загадчыка ўчастка МТС т. Радэ не выбрана з зямлі каля 50 проц. бульбы, але туды пусцілі свіней, якія стапталі ўсё бульбо-нішча. Па тэмпам уборкі бульбы ёсць пагроза, што капанне бульбы зацягнецца да замаразкаў.

Нездавальняюча ідуць бульбапастаўкі. План паставак дзяржаве і МТС выканан толькі на 48 проц

Старшыня калгаса ТРУХАНАЎ адмаўляецца здаваць бульбу за калгаснікаў, кажучы: „Хай сваю вязуць", а транспарта ім не прадстаўляе Дырэктыву аб здачы калгасамі бульбы за калгаснікаў у лік іх працадзён Труханаў не выконвае, кажучы, што не ведае пра яе.

З. БЕЛЕНЬКІ.

Дубавец „кіруе" ўборкай бульбы з горада.

Калгас імя Калініна, Машканскага сельсовета, злачынна зацягвае ўборку бульбы і пастаўкі збожжа і бульбы, дзяржаве. З засеяных 96,7 га бульбы выкапана на 10 кастрычніка 54 га, а план паставак выканан з 118 тон на 106 тон.

Замест аперацыйнага кіраўніцтва старшыня калгаса ДУБАВЕЦ з 4 да 9 кастрычніка прасядзеў у горадзе, пакінуўшы ўборку і здачу бульбы на поўны самацёк. Сакратар ячэйкі РАМАНОЎСКІ на марудныя тэмпы копкі бульбы не звяртае ніякай увагі.

БОНДАРАЎ.

Сабатажніку Міхальчанка не месца ў сельсовеце.

На шляху сабатажа збожжа і бульбапаставак стаў член сельсовета па вёсцы ГРАЛЁВА, Бабініцкага сельсовета, былы цвёрдазаданнік МІХАЛЬЧАНКА.

Прыкладам свайго сабатажа ён дэзарганізуе аднаасобнікаў. Гэтая вёска самая адстаючая ў сельсовеце па выкананні сваіх абавязацельстваў дзяржаве.

Сабатажніка Міхальчанка трэба неадкладна вывесці са складу членаў сельсовета і прыцягнуць да суровай адказнасці.

СІНКО.

Выканалі збожжа і бульбапастаўкі.

Калгас „ЩЧАМІЛАЎКА", Замастоцкага сельсовета, на 6 кастрычніка выканаў план здачы бульбы дзяржаве і прыступіў да здачы бульбы за калгаснікаў. На 10 кастрычніка здалі поўнасцю збожжавыя калгас і калгаснікі з сваіх гародаў.

Калгаснікі: СКУТАЎ, БАЛТКОЎ.

У каапгасе „Парыжская комуна" зрываецца уборка бульбы.

У каапгасе ЗВК «Парыжская комуна» уборка бульбы праходзіць вельмі марудна. На 8 кастрычніка выкапана ўсяго 32 га, што складае 60 проц. агульнага плана, выбіраецца бульба вельмі дрэнна, многа бульбы застаецца ў глебе.

Перабаранавана ўсяго 14 га бульбы, а пераворвання зусім не пачыналі

Кіруюць уборкай бульбы на 1 м участку т. КУХЦЕЕНКА, а на 2 м участку т. ЗЯЗЮЛЬКІН Яны зусім не турбуюцца і не адчуваюць адказнасці за тое, што тэрміны уборкі бульбы прайшлі.

З гародніх культур усяго ўбрана толькі 0,50 га морквы, астатнія 39 га і не крануты.

Загадчыкі ўчасткаў і дырэкцыя і не думаюць нават каб хутчэй і лепш убраць бульбу і гароднія культуры. Таксама вельмі марудна праходзіць с'іласаванне. На плану трэба засіласаваць 700 тон, а засіласавана 200 тон, не гледзячы на тое, што маецца ў дастатковай колькасці канюшынная і лугавая атавы.

Пагалоўе ската забяспечана кармамі на 60 проц.

Кіраўніцтва каапгаса і праўленне ЗВК павінны безадкладна грывяць усе захады, каб ў бліжэйшыя дні поўнасцю і добраякасна ўбраць бульбу і закончыць сіласаванне.

ПАЮЧЭНКА.

СЁННЯ ДЗЯРЖЦЫРК.

УПЯРШЫНЮ ГРАНДЫЕЗНАЯ ПАНТАМІМА (ПАЛІТІНТЭРМЕДЫЯ)

ШУМ ФАШЫСТАЎ

У пяці малюнках з апафеозам.

Пастаноўка і тэкст П. Акеанос. Удзельнічае ўся трупа цырка

Штодзённа вялікае цыркавое прадстаўленне 12 нумароў лепшых артыстаў і атракцыёнаў.

Пачатак, а 8½ г. увечары. Каса пры цырку і гарадская каса (вуг. Вагзальнай і Канатнай) адчынены з 12 да 9 гадз. вечара.

Віцебскі філіал Усесаюзнага трэста «ВЕТСНАБПРОМ» даводзіць да ведама ўсіх совгасаў, калгасаў і зацікаўленых арганізацый і устаноў, а таксама і насельніцтва, што ім АДЧЫНЕНЫ па Ленінскай вул. № 33 ВЕТЭРЫНАРНАЯ АПТЭКА І МАГАЗІН ВЕТЗАБЕСПЯЧЭННЯ. Аптэка адпускае лекі, як па рэцэптах ветлячэбніц, таксама і па вольных рэцэптах ветурачоў. Праз магазін вытвараецца забеспячэнне лабараторнымі прыладамі і веттаварамі ўсіх устаноў

961—2—1

ФЗВ панчошнікаў працягвае набор на базе 5, 6 і 7 груп васьм ў'з осце 15, 16, 17 год. Для паступлення неабходны наступныя дакументы: аб адукацыі, метрычны выпіс, аб соцыяльным паходжанні.

ВУЧНІ ЗАБЯСПЕЧВАЮЦЦА ІНТЭРНАТАМ І СТЫПЕНДЫЯЙ (ПЕРШЫЯ ТРЫ МЕСЯЦЫ 35 РУБ., ДРУГІЯ ТРЫ МЕСЯЦЫ—47 РУБ.), а таксама рабочым пайком і сталовай.

Адрас: Віцебск, Ленінская 3/2, ФЗВ панчошнікаў.

960

ПАВЕДАМЛЕННІ.

◆ 15 кастрычніка 1933 г., у 5 гадз. вечара, у памяшканні гаркома КП(б)Б (пакой № 4) адбудзецца пасяджэнне парткалегіі гарКК КП(б)Б па разгляду дзе партсправаў, на якую павінны з'явіцца наступныя тт.: Каштанаў (цагельны завод), Пруднікаў С. І., Левін, Міркулёў (завод стандартных дамоў), Фядосаў М. П. (кандуктарскі рэзерв МББ чыг.), Дзянісенка Я. (лесзавод № 13), Баркан (фабрыка імя Клары Цэткін), Кандрацэнка Я. І., Чунаеў І. Н., Шаравой М. П., Раідзіна М. А., Шыкаловскі П. К. (фабрыка імя Лекерта), Тэў (Белгандаль), Волкаў К. П. (аўтабаза), Вельтман І. Т (групком № 22 будаўнікоў), Ценераў Ц. С., Наштыкаў М. Я., Высоцкі В. Б., Сухарукаў Х. І., Варанцоў П. В. (рух МББ чыг.), Цітоў М. Я., Прыстаўка І. Ш., Сямёнаў Я. П., Жураў С. П., Рачко Ц. В., Цыкунаў Ф., Каган А. М. (цяга МББ чыг.), Гасілоўскі, Лабаненка В. І., Радзевіч У. С., Шэсоедаў С. А., Гарэлыш У. І. Ш., Сапожнікаў (інструментальная фабрыка), Герасімаў І. Ш., Гусакова А. («Прафінтэрн»), Цэзрыс К. І. (водны транспарт), Шнейдэрман, Барысава Н. Г., Б уева П. Т., Бутман Ш. Я. (фабрыка «КІМ»), Курыленка П. В., Саўнёў Н. Ш. (Учдор), Грусаў Ш. В. (завод „Комінтэрн"), Сямёнаў З. Х., Вярбіцкі, Баліманаў, Барык (ЦРК), Вулкін Д. І. (2 Маркаўтчына), Лу..... (трамвай, Трафімаў С. Е. (рабпрасаюз), Курбанаў Т. (завод „Чырвоны металіст"), Карпынёў (гарсовет), Пазнякоў (шчацін а шчотачны камбінат), Вінакураў М. Б. (Машканскі сельсовет).